Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 39 (6015) | 17 лютага 1938 г., чацвер | ЦАНА 10 КАП.

Калі падпальшчыкі вайны адважацца напасці на Совецкі Саюз, Чырвоная Армія і Флот абрушаць на ворага ўсю сілу сваёй тэхнікі, усю магутнасць сваёй арганізацыі, усю згуртаванасць сваіх жалезных батальёнаў, увесь свой гераізм, каб знішчыць ворага на яго тэрыторыі.

Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот ведаюць, што ў гэтай барацьбе яны будуць падтрыманы ўсім совецкім народам, што сіла Чырвонай Арміі будзе памножана сілай маральнага і палітычнага адзінства вялікага совецкага народа, сілай моцнасці яе тылу.

[З тэзісаў да 20-годдзя Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота].

АРМІЯ СОВЕЦКАГА НАРОДА

Праз шэсць дзён уся вялікая, неабсяжная Краіна Советаў, увесь 170-мільённы совецкі народ будзе святкаваць 20-ю гадавіну Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. Дзень 20-годдзя Чырвонай Арміі — арміі вызваленых рабочых і сялян, арміі дыктатуры пролетарыята — дзень вялікага ўсенароднага свята.

Учора ў нашай газеце апублікаваны тэзісы для прапагандыстаў, прысвечаныя знамянальнаму дню—23 лютага. У гэтых тэзісах ярка адлюстроўваецца баявы шлях Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота, якія ўпісалі ў гісторыю грамадзянскай вайны незабыўныя старонкі, поўныя мужнасці, гераізму і самаадданасці, пакрылі неўвядальнай славай чырвоныя сцягі краіны Советаў.

У гэтых тэзісах паказан ўвесь шлях, пройдзены Чырвонай Арміяй за 20 год пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, шлях ператварэння яе з слабых, разрозненых атрадаў рабочых і сялян у магутную армію, узброеную першакласнай тэхнікай, у грозную, страшную для ворагаў сілу.

Створаная ў агні грамадзянскай вайны, Чырвоная Армія ўжо 20 год стаіць на варце першай у свеце социялістычнай дзяржавы рабочых і сялян.

Совецкі народ любіць і ганарыцца сваёй арміяй, якая ў гераічных баях выратавала нашу радзіму ад капіталістычнай кабалы, адстаяла незалежнасць краіны і свабоду працоўных мас. Совецкі народ ганарыцца сваёй арміяй, якая пільна ахоўвае сталінскую дружбу народаў, верна служыць справе социялізма, самааддана абараняе вялікія завaёвы Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі. Совецкі народ горача любіць сваю Чырвоную Армію, якая вырасла ў магутную рэволюцыйную сілу, моцны аплот міру, надзею і радасць для прыгнечаных і абяздоленых усяго свету.

У годы грамадзянскай вайны, у лютых баях з унутранымі і знешнімі ворагамі Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот даказалі ўсяму свету сілу і непераможнасць саюза рабочага класа і сялянства, кіруемага партыяй Леніна — Сталіна. У баях супроць полчышчаў інтэрвентаў і белагвардзейскіх генералаў, у баях за свабоду і незалежнасць социялістычнай краіны раслі, мацнелі, гартаваліся Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот.

На працягу трох год мацёрыя драпежнікі Антанты арганізоўвалі паходы інтэрвентаў і белагвардзейскіх армій супроць Совецкай Расіі. Напалоханыя поспехамі социялістычнай рэволюцыі, баючыся рэволюцыйнага ўзрыву ўнутры сваіх краін, імперыялісты імкнуліся задушыць маладую Совецкую рэспубліку, затапіць у крыві першую ў свеце ўладу рабочых і сялян. З поўначы, з захаду, з усходу і поўдню наступалі ворагі. Былі месяцы, калі Совецкая Расія была акружана вогненым кальцом контррэволюцыі. Чатырнаццаць імперыялістычных дзяржаў ішлі на рэспубліку Советаў. Але поўгалодныя, разутыя, дрэнна ўзброеныя палкі Чырвонай Арміі разграмілі арміі інтэрвентаў і белагвардзейцаў, узброеных да зубоў міжнароднымі імперыялістамі. Тры паходы Антанты скончыліся поўным крахам.

Чырвоная Армія і Чырвоны Флот з гонарам выканалі сваю надзвычай цяжкую, але пачэсную задачу — адстаяць завaёвы Кастрычніцкай рэволюцыі.

У 1922 годзе японскія імперыялісты апошнімі пакінулі межы совецкай краіны, былі змецены ў мора апошнія рэшткі інтэрвентаў. З таго часу на неабсяжных прасторах совецкай зямлі — ад Менска да Владзівастока, ад Архангельска да Ерэвана — горда рэе чырвоны сцяг социялізма.

Чаму Чырвоная Армія вышла пераможцам у грамадзянскай вайне? Чаму рабочыя і сяляне совецкай краіны разграмілі нашчэнт першакласныя, выпкаленыя армії міжнароднага імперыялізма і ўнутранай контррэволюцыі?

Як мог здарыцца такі цуд?

Чырвоная Армія дабілася велізарных перамог таму, што яна выконвала волю народа, таму, што яна абараняла, змагалася за яго кроўную справу. Чырвоная Армія перамагла таму, што яна, адзіная ў свеце, у сваёй барацьбе апіралася на спачуванне і падтрымание з боку мільёнаў рабочых і сялян, чэрпаючы ў гэтым сваю сілу.

Яна вышла пераможцам таму, што яе ўсяляк падтрымлівалі працоўныя ўсіх нацыянальнасцей нашай радзімы, якім яна на сваіх штыхах несла вызваленне ад нацыянальнага і социяльнага прыгнечання.

Перамогі Чырвонай Арміі былі атрыманы таксама дзякуючы таму, што на абарону совецкай краіны, на абарону першай у свеце социялістычнай дзяржавы выступілі рабочыя раду капіталістычных дзяржаў.

І, нарэшце, асноўнай і рашаючай умовай перамогі з'явілася кіраўніцтва большэвіцкай партыі. Геніяльныя стратэгі рэволюцыі Ленін і Сталін непасрэдна кіравалі баявымі аперацыямі Чырвонай Арміі і Чырвонага Флота. Партыя паслала на фронт сваіх лепшых сыноў, якія паказалі незабыўныя ўзоры гераізму, самаадданасці, бясстрашнасці і рэволюцыйнага энтузіязму. На чале Чырвонай Арміі стаялі лепшыя пролетарскія палкаводцы, мужныя ленінцы-большэвікі таварышы Варашылаў і Фрунзе.

Ленінская стратэгія, памножаная на рэволюцыйную энергію і самаадданасць, жалезная дысцыпліна, бязлітасная, непрымірымая барацьба са здраднікамі трацкістамі—бухарынцамі з'явіліся залогам бліскучых перамог Чырвонай Арміі ў яе няроўнай, цяжкай барацьбе з шматлікімі ворагамі.

Прайшло больш 16 год з таго часу, як апошнія інтэрвенты былі выгнаны з совецкай зямлі. Увесь гэты час совецкі народ жыве ва ўмовах мірнай социялістычнай працы. На варце міру стаіць магутная, узбагачаная новай тэхнікай, Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот. Совецкі народ клопатамі і любоўю акружае сваю армію — аплот мірнай працы. Совецкі народ увесь час упарта працуе над умацаваннем магутнасці Чырвонай Арміі, над умацаваннем абароназдольнасці Краіны Советаў.

У рэзультаце двух сталінскіх пяцігодак абаронная магутнасць СССР надзвычай узрасла.

«З краіны слабай і непадрыхтаванай да абароны Совецкі Саюз ператварыўся ў краіну магутную ў сэнсе абароназдольнасці, у краіну, гатовую да ўсякіх выпадковасцей, у краіну, здольную вырабляць у масавым маштабе ўсе сучасныя прылады абароны і забяспечыць імі сваю армію ў выпадку нападу звонку». (Сталін).

СССР настойліва, нястомна змагаецца за мір. Перад тварам гнусных правакацый і шалёнага звярынага выцця фашысцкіх канібалаў, перад тварам ваеннай небяспекі — наша краіна праяўляе жалезную вытрыманасць, спакой і халоднакроўе. Але совецкі народ не баіцца пагроз і заўсёды гатоў да абароны сваёй радзімы. Магутны сваім маналітным адзінствам, сваёй згуртаванасцю вакол партыі, совецкі народ з'яўляецца несакрушальнай апорай і моцным тылам Чырвонай Арміі. Грозная сіла Чырвонай Арміі, падтрымліваемай усёй краінай, знішчыць усіх тых, хто папрабуе парушыць недатыкальнасць свяшчэнных совецкіх граніц.

Чырвоная Армія падрыхтавана сустрэць любога ворага і абрушыць на яго ўсю сілу сваёй тэхнікі, усю згуртаванасць сваіх жалезных батальёнаў.

Мы вайны не хочам, але заўсёды да яе гатовы! Няхай памятаюць аб гэтым фашысцкія падпальшчыкі вайны.

АГУЛЬНЫ СХОД РЭДАКТАРОЎ, РАБКОРАЎ І ВАЕНКОРАЎ

Учора ў памяшканні менскага Дома партактыва адбыўся агульны сход рэдактароў шматтыражных і насценных газет прадпрыемстваў, устаноў, навучальных устаноў, вайсковых часцей, рабкораў і ваенкораў. Прысутнічала звыш 500 чалавек. Даклад на тэму «20-годдзе Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота» зрабіў загадчык аддзелам друку ЦК КП(б)Б т. Малін.

У сваім дакладзе тав. Малін спыніўся на пытаннях аб ролі і значэнні друку ў справе падрыхтоўкі і правядзення слаўнага юбілею нашай доблеснай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. Шматтыражкі і насценныя газеты павінны проста і цікава расказаць сваім чытачам пра шлях барацьбы і перамог Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. Яны павінны паказаць ролю партыі Леніна і Сталіна і вялікіх правадыроў рэволюцыі Леніна і Сталіна ў стварэнні Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

На розных участках социялістычнага будаўніцтва ёсць людзі, якія прымалі ўдзел у грамадзянскай вайне. На старонках шматтыражак і ў насценных газетах трэба друкаваць найбольш яркія ўспаміны гэтых таварышаў. У нізавым друку павінны знайсці адлюстраванне быт і вучоба ў РСЧА. На кожным прадпрыемстве ці ўстанове можна знайсці таварышаў, якія праходзілі службу ў радах РСЧА. Вельмі карысна, каб яны расказалі праз друк, як яны вучыліся і выхоўваліся, якой выдатнай школай выхавання з'яўляецца Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія. Таксама неабходна друкаваць матэрыялы аб лепшых байцах і камандзірах, аб выдатніках баявой і палітычнай падрыхтоўкі.

У заключэнне схода прысутныя праглядзелі выдатны кінофільм «Мы з Кранштата».

ХРОНІКА

Совет Народных Камісараў Саюза ССР зацвердзіў тав. Логінава Н. І. намеснікам начальніка Галоўнага ўпраўлення Грамадзянскага паветранага флота пры СНК СССР.

СНК СССР зацвердзіў тав. Маркелава І. Е. намеснікам старшыні Усесаюзнага Камітэта па справах мастацтва пры СНК СССР.

ЗАКРЫЛАСЯ IV СЕСІЯ ВЦВК XVI СКЛІКАННЯ

ДЗЕННІК ЗАКЛЮЧНАГА ПАСЯДЖЭННЯ 16 ЛЮТАГА

Раніцай 16 лютага пад старшынствам тав. М. І. Калініна адбылося заключнае пасяджэнне IV сесіі Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта XVI склікання. Усе выступаўшыя ў спрэчках па дакладу тав. Н. А. Булганіна аднадушна ўхвалялі ўнесены на зацвярджэнне сесіі праект Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет РСФСР.

Сакратар ВЦСПС тав. Л. С. Брэгман гаворыць, што надыходзячыя выбары ў Вярхоўны Совет РСФСР будуць праходзіць на аснове маральна-палітычнага адзінства народа і прынясуць новую перамогу сталінскаму блоку комуністаў і беспартыйных. Гаворачы аб масава-палітычнай рабоце профсаюзаў у часе выбараў у Вярхоўны Совет СССР, тав. Брэгман паведамляе, што звыш 10 мільёнаў членаў профсаюзаў займаліся ў гуртках па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і выбарчага закона. Агітацыйна-прапагандысцкую работу неабходна ўсямерна ўзмацніць у ходзе падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Совет РСФСР.

Аддаць асаблівую ўвагу складанню спісаў выбаршчыкаў і паклапаціцца аб папярэдняй рассылцы бланкаў гэтых спісаў прапануе старшыня оргкамітэта Усерасійскага ЦВК па Краснадарскаму краю тав. І. С. Багданаў. Пад гарачыя апладысменты тав. Багданаў заяўляе:

— Няма і не будзе больш той Кубані, на якую разлічвалі контррэволюцыйныя трацкісты, бухарынцы і іншыя ворагі народа. Цяпер совецкае калгаснае казацтва Кубані чэсна працуе на чарназёмных палях, змагаецца за выкананне ўказання таварыша Сталіна аб зборы 7—8 мільярдаў пудоў хлеба за год. Калі вораг адважыцца сунуць сваё свіное рыла ў наш совецкі гарод, то казакі Кубані будуць біць ворага на яго-ж тэрыторыі.

Затым выступае старшыня Варонежскага аблвыканкома тав. П. А. Ватолін, які прыводзіць яркія факты вялікага ўздыму сельскай гаспадаркі і прамысловасці Варонежскай вобласці.

Аб шчаслівым, радасным, культурным жыцці чувашскага народа пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі гаворыць старшыня Соўнаркома Чувашскай АССР тав. Л. С. Спасаў. У заключнай частцы сваёй прамовы тав. Спасаў падвяргае крытыцы практычную дзейнасць Наркамзема і Наркамлегпрома РСФСР і гаворыць, што ўрад РСФСР павінен узяцца за паляпшэнне работы гэтых наркаматаў.

Нарком социяльнага забеспячэння РСФСР тав. М. А. Шабураў паведамляе, што за годы другой пяцігодкі па СССР толькі на пенсіі было адпушчана 6.250 млн. рублёў. Зараз гадавы бюджэт аднаго Наркамсабеза РСФСР роўны гадавым дзяржаўным бюджэтам пяці краін — Швецыі, Фінляндыі, Літвы, Латвіі і Эстоніі, разам узятым.

— Перад партыйнымі і грамадскімі арганізацыямі, — гаворыць старшыня Горкаўскага абласнога выканаўчага камітэта тав. А. Н. Бураў, — стаіць задача забяспечыць узорнае правядзенне выбараў у Вярхоўны Совет РСФСР. Сур'ёзнейшая ўвага павінна быць аддадзена арганізацыйна-тэхнічным пытанням. Вялікай палітычнай работай з'яўляецца складанне спісаў выбаршчыкаў, і яе нельга даручаць другарадным людзям, як гэта было ў асобных выпадках у прайшоўшую выбарчую кампанію.

Член Прэзідыума Усерасійскага ЦВК тав. А. В. Арцюхіна гаворыць аб радасным жыцці жанчын-тэкстыльшчыц у Совецкім Саюзе. Тав. Арцюхіна прыводзіць цікавыя лічбы, якія паказваюць надзвычай узросшую ролю жанчыны ў кіраўніцтве вытворчасцю.

На заключным пасяджэнні сесіі выступілі таксама старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Мардоўскай АССР тав. М. А. Чэмбулатаў, студэнтка Вышэйшай комуністычнай сельскагаспадарчай школы тав. А. Я. Чужынава, намеснік старшыні Совета Народных Камісараў РСФСР тав. С. Б. Задзіончанка.

Пасля прамовы тав. Задзіончанка тав. Калінін паведамляе, што паступілі прапановы аб спыненні спрэчак па дакладу тав. Булганіна. Сесія прымае рашэнне — спрэчкі спыніць.

Дакладчык тав. Булганін паведамляе, што ён згодзен з папраўкамі тав. Задзіончанкі і адзначае поўную аднадушнасць сесіі ў ацэнцы прадстаўленага праекта Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет РСФСР.

Сесія прымае папраўкі, унесеныя тав. Задзіончанкам. Праект ставіцца на галасаванне і аднагалосна зацвярджаецца.

Прыняццем выбарчага закона Расійскай Совецкай Федэратыўнай Социялістычнай Рэспублікі парадак дня вычэрпваецца. Старшынствуючы тав. М. І. Калінін абвяшчае IV сесію Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта закрытай.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

Рэспубліканская артылерыя падвергла моцнаму абстрэлу пазіцыі мяцежнікаў у раёне Брунетэ і ў сектары ракі Харама (на паўднёвы ўсход ад Мадрыда). Мяцежнікі прабавалі атакаваць рэспубліканскія пазіцыі ў сектары Куэста дэ Ла Рэйна, але былі адбіты.

Рэспубліканскія войскі, узарваўшы ў Карабанчэль Бахо тры міны, прасунуліся наперад да ваеннага шпіталя.

УСХОДНІ ФРОНТ

Рэспубліканскія войскі 15 лютага прадпрынялі наступленне ў сектары Вільянуэва дэль Рэбальяр на фронце шырынёю ў 4 кілометры і занялі рад пазіцый мяцежнікаў. Узята ў палон 150 мяцежнікаў, зброя і боеприпасы.

У раёне Вівель дэль Рыо (на захад ад Монтальбана) рэспубліканскія войскі таксама занялі рад пазіцый мяцежнікаў, адбіўшы ўсе контратакі праціўніка.

ГІТЛЕР ПРАД'ЯВІЎ УЛЬТЫМАТУМ АЎСТРЫІ

ПАРЫЖ, 16 лютага. (БЕЛТА). У друку прыводзяцца новыя важныя даныя аб акалічнасцях, суправаджаючых капітуляцыю Шушніга (аўстрыйскага канцлера) перад патрабаваннямі Гітлера. Германскі ўльтыматум аўстрыйскаму ўраду быў «падмацован» канцэнтрацыяй германскіх войск на Баварскай і Тырольскай граніцах.

Па словах газеты «Жур», Папен (германскі пасланнік у Вене) учора патрабаваў ад Шушніга адказу на патрабаванне Гітлера да 6 гадзін вечара, пагражаючы, што інакш германскія войскі ўступяць у Куфштэйн, Зальцбург і Лінц — гарады на аўстра-германскай граніцы. Табуі ў газеце «Эвр» знаходзіць, што паміж Гітлерам і Мусаліні было загадзя дасягнута пагадненне па аўстрыйскаму пытанню. Адмаўляючыся ад сваіх прэтэнзій у Аўстрыі, Мусаліні ўзамен атрымаў запэўненні аб падтрыманні Гітлерам італьянскіх аперацый у Іспаніі. Гітлер, па словах Табуі, абавязаўся садзейнічаць італьянскаму наступленню на Альмерыю і Картахену (гарады на поўдні Іспаніі).

***

ЛОНДАН, 16 лютага (БЕЛТА). Адна высокапастаўленая асоба заявіла венскаму карэспандэнту агенцтва Рэйтэр, што ўдоўж усёй аўстра-германскай граніцы адбываюцца вялікія перакідванні матарызаваных, паветраных і іншых часцей германскай арміі. Далей карэспандэнт піша, што перад Аўстрыяй стаіць пытанне так: ці задаволіцца Германія тым, што Аўстрыя прарабіла. Змены ў складзе аўстрыйскага кабінета з'яўляюцца адчайнай спробай уцяхамірыць Гітлера. Аднак існуе апасенне, што Гітлер не задаволіцца гэтымі зменамі. (Пры нядаўняй сустрэчы аўстрыйскага канцлера Шушніга з Гітлерам у Берхцесгадэне, Гітлер патрабаваў далучэння Аўстрыі да «асі Рым—Берлін», прадастаўлення аўстрыйскім гітлераўцам міністэрскіх партфеляў ва ўрадзе і ўдзелу Аўстрыі ў антыкомуністычным пакце. Шушніг спачатку адхіліў гэтыя патрабаванні).

КРЫТЫЧНАЕ СТАНОВІШЧА НОВАГА РУМЫНСКАГА КАБІНЕТА

ВЕНА, 15 лютага. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Бухарэста, у сувязі з катастрафічным становішчам, стварыўшымся ў Румыніі, быстра выявілася няўстойлівасць новай урадавай камбінацыі. Ужо вырашана пытанне аб адстаўцы главы ўрада патрыярха Мірона Крысцеа. Чакаецца, што прэм'ерам будзе назначан Татарэску, які ўзначаліць кабінет ваеннай дыктатуры.

Як вядома, ужо праведзен рад мер, азначаючых поўную ліквідацыю канстытуцыі і перадачу ўсёй улады на месцах начальнікам гарнізонаў. Партыі распушчаны, газеты закрываюцца. Кіруючая кліка падрыхтоўвае окліканне асобага каралеўскага совета для афармлення неабмежаванай каралеўскай улады і рэжыма ваеннай дыктатуры.

Растуць новыя тэхнічныя кадры нашай краіны. На магілёўскай шаўковай фабрыцы імя Куйбышэва малады змены імкнуцца пакуніст тав. І. І. Сафонаў выпучан на работу начальніка ТЭЦ. На здымку: тав. І. І. Сафонаў. Фото Вернера (БСФ).

ЛЁТЧЫКІ тт. ЧЭРАВІЧНЫ І ВЛАСАЎ НА КРЫЗЕ ПАПАНІНА

15 лютага, у 15 гадзін, з крыгі, якая служыць аэрадромам для «Мурмана», вылецеў на «Ш-2» лётчык Чэравічны з пілотам Карабанавым. З імі знаходзіўся 10-сутачны запас прадуктаў харчавання і падагравальная лямпа. З прычыны снегападу і дрэннай бачнасці Чэравічны назад не вярнуўся. У гэты-ж час з борта «Таймыра» вылецеў на «У-2» лётчык Власаў, які прабыў у палёце 2 гадзіны і нічога з прычыны снегападу не выявіў, вярнуўся і сеў на крыгу ля «Мурмана».

16 лютага лётчык Чэравічны вярнуўся на борт «Мурмана» і зноў вылецеў на «Ш-2» у напрамку да лагера (у 17 г. 15 мін.). У 18 г. 35 мін. Чэравічны сеў у лагеры Папаніна. У той-жа час вылецеў і лётчык Власаў на «У-2». У 18 г. 55 мін. Власаў сеў каля лагера Папаніна. У 19 г. 06 м. Власаў падняўся і накіраваўся да судна.

У 09 г. 16 лютага ў часе радыётэлефонных перагавораў «Таймыр» — Масква тав. Остальцэў паведаміў, што ён гаварыў у 24 гадзіны 15 лютага з Папаніным, які заявіў, што можа добра пратрымацца на крызе не менш трох месяцаў. Апошнія каардынаты крыгі: шырата 71 градус 13 мінут, даўгата 20 градусаў 05 мінут. 16 лютага, пасля прылёту Власава да лагера Папаніна, тав. Остальцэў вёў перагаворы з Папаніным аб парадку зняцця людзей і матэрыялаў. Тав. Папанін паведаміў, што адназ на гэтыя пытанні ён дасць 16 лютага.

ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ СТАНОВІШЧЫ НА „ТАЙМЫРЫ"

15 лютага ў 5 гадз. 45 мін. па маскоўскаму часу начальніку радыёцэнтра Галоўпаўночмаршляху тав. Волкаву ўдалося наладзіць прамую тэлеграфную сувязь Масква—«Таймыр». Размова з «Таймырам» прадаўжалася да 7 гадз. 43 мін.

У 6 гадз. 00 мін. тав. Ушакоў выклікаў к апарату тав. Остальцэва. Адбылася наступная гутарка:

УШАКОЎ. Неадкладна папрасіце к апарату Остальцэва. Гаворыць Ушакоў. Прывет. Паведаміце план аперацыі, што, калі думаеце рабіць, якая сувязь з Папаніным, становішча карабля, становішча надвор'я, адлегласць да лагера, да «Мурмана» і «Мурманца», становішча сувязі «Мурмана» з «Мурманцам», стан ільду.

ОСТАЛЬЦЭЎ.—Прывітанне, Георгій Аляксеевіч. План такі: зараз ужо выгрузілі «У-2», адначасова чысцім аэрадром. Вылецім пры наяўнасці бачнасці. Сувязь наогул добрая. З Крэнкелем гавару два разы ў дзень па мікрафону. Апрача гэтага, абменьваемся дымам або святлом. Да лагера некалькі менш 20 міль, бо добра бачым іх слабенькі касцёр. «Мурманец» далёка. Лёд буйнабіты, змяраючыйся, таўшчынёю ў сярэднім 3—4 метры. Надвор'е зараз добрае. Месяц, мароз каля 20 градусаў. Відаць Грэнландыя. З «Мурманам» магу працаваць любы час. «Мурманца» не чуем. Становішча «Таймыра» пакуль выдатнае. Не гледзячы на стомленасць пасля чатырох штормаў у адкрытым моры, потым у ільдах, каманда працуе, як эвяры. Вось пакуль усё. Добра, што папярэдзілі наконт пасылкі партыі да лагера. Тэлеграма Масквы дапамагла мне спыніць зарываючыхся. Усе ірвуцца на любую аперацыю. Для стрымлівання прыходзіцца траціць гадзіны на ўгаварванне.

(БЕЛТА).

У НАРКАМАЦЕ ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ

Народным камісарам замежных спраў тав. М. М. Літвінавым атрымана нота ад іранскага пасла п. Сепахбодзі, у якой апошні, па даручэнню свайго ўрада, абвяргае ў катэгарычнай форме з'явіўшыеся ў замежным друку паведамленні адносна перагавораў, якія быццам вядуцца паміж Іранам, Турцыяй, Афганістанам і Іракам аб дапаўненні падпісанага гэтымі дзяржавамі ў мінулым годзе пакта, так званым, антыкомуністычным пагадненнем.

***

У выніку меўшых месца дыпламатычных перагавораў паміж урадамі СССР і Афганістана дасягнута пагадненне аб закрыцці з 1 красавіка с. г. афганскіх консульстваў у СССР і совецкіх у Афганістане.

Роўным чынам брытанскі ўрад паведаміў НКЗС аб прадстаячым закрыцці ім брытанскага генеральнага консульства ў Ленінградзе.

ХЛУСЛІВЫЯ ПАВЕДАМЛЕННІ ЯПОНСКІХ ГАЗЕТ

У сувязі з распаўсюджваемымі японскімі газетамі паведамленнямі з Чаньчуня аб быццам адбыўшайся 14 лютага г.г. сутычцы на совецка-манчжурскай граніцы, блізка ад ст. Пагранічная, пры якой совецкія пагранічнікі быццам ўглыбіліся на манчжурскую тэрыторыю на 150 метраў і адкрылі агонь, але былі адцеснены япона-манчжурскай аховай, — ТАСС навёў даведкі ў паінфармаваных колах і ўстанавіў, што гэта паведамленне з'яўляецца чысцейшым вымыслам. У гэты дзень ніякай сутычкі на совецка-манчжурскай граніцы не было.

(БЕЛТА).

ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ РЫХТАВАЦЦА ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

ВІТАЕМ НОВУЮ СІСТЭМУ ФІНАНСАВАННЯ МТС

Новы парадак фінансавання машынна-трактарных станцый, які ўстаноўлен пастановай СНК СССР, ускладае вялікую адказнасць на нас — дырэктараў МТС, на ўсіх работнікаў зямельных органаў.

Улічыўшы ўсё гэта, работнікі нашай МТС намецілі рад канкрэтных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да пераходу на новую сістэму фінансавання.

Па-першае, мы звярнулі асаблівую ўвагу на спагнанне натураплаты і грошай за работу МТС з калгасаў. У кожны сельскі совет і калгас пасланы зямельныя работнікі. У гэтай справе мы ўжо маем добрыя вынікі. У бліжэйшы час уся дэбіторская запазычанасць будзе поўнасцю спагнана.

Зараз МТС прыступіць да складання каштарысу. Мы ўлічваем ўсе неабходныя расходы і мяркуемыя прыбыткі, каб нічога не было ўпушчана. Мы добра разумеем, што ад складзенага каштарысу залежыць правільны зварот сродкаў і работа ўсёй МТС на працягу года.

З урокаў мінулага года мы ведаем, што ўсякія несур'ёзныя адносіны да складання каштарысу прыводзяць да дрэнных вынікаў. Напрыклад, па каштарысу 1937 года не быў прадугледжан каваль. А ў МТС без каваля ніяк нельга абыйсціся. Прышлося аплачваць кавалю за рахунак рамонту, што ўдаражыла кошт рамонту машын. Такое становішча не толькі ў нашай МТС, але і ў радзе іншых.

Наша МТС да 1 лютага выканала план рамонту трактараў, які ўстаноўлен Наркамземам БССР. Апрача плана на 10 лютага было выпушчана з бягучага рамонту 8 трактары, астатнія 8 трактараў рабочыя майстэрні абавязаліся адрамантаваць не пазней 20 лютага. К гэтаму-ж тэрміну мы адрамантуем усе сельскагаспадарчыя машыны.

Да вясны мы поўнасцю загатовілі гаручае. На сядзібу вывезлі 30 тон. Зараз падрыхтоўваем 7 цыстэрн і да канца месяца завязем гаручае ў брыгады.

Правялі вялікую работу па перабудове трактарных брыгад. Да кожнай прымацавалі не больш 3 машын, што дасць магчымасць лепш арганізаваць тэхнічнае абслугоўванне трактараў і наладзіць учот работы трактарыстаў.

Пры абмеркаванні пастановы СНК СССР трактарныя брыгады ўзялі на сябе абавязацельства — даць на кожны трактар у сярэднім 600 — 700 гектараў, зэканоміць гаручае, забяспечыць высокі ўраджай сацыялістычных палёў.

У павышэнні ўраджайнасці вялікім стымулам з'яўляецца пастанова ўрада, згодна якой устанаўляецца некалькі відаў заахвочванняў за добрую работу МТС.

Усе рабочыя МТС гатовы змагацца за выкананне важнейшай пастановы ўрада, якая з'яўляецца магутным вагаром у паляпшэнні работы машынна-трактарных станцый.

Дамінік Вікенцьевіч ЕЛЕНСКІ,
дырэктар Селюцкай МТС, Віцебскага раёна.

Экспанат Усеукраінскай мастацкай выстаўкі — скульптура «На граніцы».
(Работа скульптара-дацэнта Украінскага мастацкага інстытута М. І. Гольмана).

НА ЛЕСАЗАГАТОЎКАХ

УРОКІ ПЕРШЫХ ДЗЁН

Прайшло 10 дзён стаханаўскага месячніка на лесазагатоўках і вывазцы. Даныя аб рабоце леспрамгасаў і механізаваных пунктаў за першую пяцідзённку (з 5 па 10 лютага) гавораць аб тым, што на месцах не падрыхтаваліся як належыць да месячніка. Асабліва ярка пацвярджае гэта работа механізаваных пунктаў.

Амаль усе аўтабазы і трактарныя пункты ў дні стаханаўскага месячніка зменшылі вывазку драўніны ў параўнанні з першай пяцідзённкай лютага. Напрыклад, Рэчыцкі мехпункт знізіў вывазку ў першай пяцідзённы месячніка на 400 кубаметраў. У Бабруйскім мехпункце з 18 аўтамашын працуе 7. Сем машын прастаялі пяць дзён з-за адсутнасці гаручага. На Ухвальскім мехпункце нагрузка на аўтамашыну зусім мізэрная (4,3 кубаметра). У Касцюковіцкім леспрамгасе сістэматычна прастайваюць 12 аўтамашын, — патрэбен трактар для расчысткі дарогі. Раённае кіраўніцтва не аказвае леспрамгасу ў гэтай справе садзейнасці.

Дрэнная работа мехпунктаў вельмі адбіваецца на выкананні квартальнага плана. За першыя пяць дзён месячніка па ўсяму трэсту Лесбел вывезена на 12 тысяч кубаметраў менш у параўнанні з папярэдняй пяцідзённкай. План выканан менш чым на 50 процантаў. Няма ніякага зруху і на загатоўках.

Толькі адзінкавыя леспрамгасы далі прырост. Напрыклад, Ельскі леспрамгас вывез за 5 дзён 3.700 кубаметраў лесу супроць 400 кубаметраў у папярэдняй пяцідзённы. Квартальны план выканан на 10 лютага на 59 проц. Але затое такія буйнейшыя леспрамгасы, як Крупскі, Асіпавіцкі, Лагойскі, Петрыкаўскі, Мазырскі і інш., знізілі вывазку лесу.

У дні стаханаўскага месячніка па Крупскаму леспрамгасу значна зменшыўся выхад лесарубаў і возчыкаў. Культурна-бытавым становішчам рабочых у лесе ніхто не цікавіцца. Рабочым нават вады ў лес не падвозяць. Ім прыходзіцца па 5—6 кілометраў штодзённа хадзіць дамоў пехатою. Выключна дрэнна арганізавана праца лесарубаў. Каб навастрыць пілу, трэба ісці шукаць пілаточку за некалькі кілометраў. Пілы, сякеры падаюцца, у большасці, старыя, ломаныя.

У лесе не разгорнут стаханаўскі рух. Вопыт перадавікоў, тысячнікаў-лесарубаў не папулярызуецца. Работнікі леспрамгасаў яшчэ не ўсвядомілі таго, што развіццё масавага стаханаўскага руху патрабуе ў першую чаргу стварэння ўмоў работы для кожнага лесаруба, возчыка, трактарыста.

Сацыялістычнае спаборніцтва між леспрамгасамі, мехпунктамі на хутчэйшае выкананне квартальнага плана не арганізавана.

Работа першай пяцідзённкі стаханаўскага месячніка павінна паслужыць урокам для ўсіх работнікаў леспрамгасаў, для кіраўнікоў партыйных і совецкіх арганізацый адстаючых раёнаў. План лесавывазкі ў стаханаўскім месячніку павінен быць перавыкананы.

У ЗВЯНЕ ФЯДОРЫ ЛАПКОЎСКАЙ

Фядора Лапкоўская ўжо трэці год працуе звеннявой па ільну ў калгасе імя Ільіча, Акіманскага сельсовета, Полацкага раёна. Усе годы яна дабіваецца высокіх ураджаеў. У мінулым годзе звяно Фядоры сабрала са свайго ўчастка падвойны ўраджай ільну.

Думкі аб заваяванні высокага ўраджаю, — успамінае звеннявая тав. Лапкоўская, — узніклі з пачатку восені пазалеташняга года. Я падабрала сабе ўчастак пад вясліва глыбінёй у 17 см.

Вясной у лагчынках і ірвах яшчэ ляжаў снег, а Фядора ўжо распачала сваю работу на ўчастку. Пасеяла лён перад 1 маем на добра ўгноенай і апрацаванай глебе. Рос ён роўным высокім. У хуткім часе пасля першай падкормкі аміячнай селітрай, пачалі праполку. У трэці раз прапалолі, калі лён падыходзіў пад цвет. Да перыяду спеласці лён дасягаў 1 метра 10 см. вышынёй.

На 70-ты дзень пасля пасеву лён выцерабілі. Быў канец ліпеня. Да восені аставалася многа часу. У Фядоры з'явілася думка: «а што калі лён пасеяць у другі раз». Гэтымі думкамі яна абмянялася з калгаснікамі і праўленнем калгаса. Усе згадзіліся з Фядорай.

Не марудзячы, на трэці дзень пасля ўборкі ільну, участак узаралі трактарам, падмацаваўшы глебу мінеральным угнаеннем. Лён пасеялі ў другі раз. Ён хутка ўзышоў і хутка стаў расці. Два разы яго праполвалі і зрабілі адну падкормку. На 65 дзень пасля сяўбы галоўкі ільну парыжавелі. Выцерабілі яго. Да замаразкаў ён добра вылежаўся на сцелішчы.

Вынік такі: першы пасеў даў ураджай валакна 9,2 цэнтнера, а другі — 7 цэнтнераў з гектара.

У гэтым годзе звяно Фядоры Лапкоўскай з вялікім уздымам рыхтуецца да вясны. Звяно ўзяло абавязацельства дабіцца з гектара 12 цэнтнераў валакна. Участак пад пасеў падабраны яшчэ з восені і ўзараны на зяблёва.

Зараз праводзіцца вялікая работа па загатоўцы мясцовых угнаенняў. Нядаўна звяно арганізавала аб' езд двароў калгаснікаў і з чардакоў сабрала 8 цэнтнераў птушынага памёту. Сабрана многа попелу і загатоўлена патрэбная колькасць мінеральных угнаенняў.

Насенне для пасеву ўжо засыпана і ачышчана. Захоўваецца яно ў сухім і добрым свірне.

Разам з падрыхтоўкай да сяўбы ў звяне разгорнута агранамічная вучоба. Па вечарах на агратэхнічным гуртку калгасніцы вывучаюць правілы сяўбы, догляду і апрацоўкі ільну.

Калгасніцы звяна Фядоры Лапкоўскай спаборнічаюць паміж сабой за два ўраджаі ільну з аднаго гектара, за высокі нумар валакна.

Ал. ЖЫХАРАЎ.

Аднаасобнікі ўступаюць у калгасы

Калгас «Ленінскі шлях», Асташкавіцкага сельсовета, Даманавіцкага раёна, меў у мінулым годзе высокі ўраджай. На працадзень калгаснікі атрымалі па 4 кілограмы збожжа, 1 руб. грошай, многа бульбы і розных прадуктаў.

Высокі працадзень калгаснікаў выклікаў прыліў у калгас працоўных аднаасобнікаў. З першага лютага ў калгас падалі заявы 15 гаспадарак, з якіх 9 аднаасобнікаў з хутароў. Яны просяць дапамагчы перавесці іх сядзібы ў цэнтр калгаса. **М. І. ШЭНЕЦ.**

УВАГА ТЭХНІЦЫ БЕЗАПАСНАСЦІ

На Акцябрскім механізаваным пункце ў Асіпавіцкім раёне не клапоцяцца аб ахове працы рабочых. Наадварот, тут стала сістэмай парушаць правілы тэхнікі безапаснасці. Рабочыя грузяць лес голымі рукамі, бо няма рукавіц. Таксама няма канатаў, што ўскладняе працэс работы.

Валку лесу трэба рабіць такім чынам, каб адлегласць паміж брыгадамі лесарубаў была не менш 50 метраў. На Акцябрскім механізаваным пункце гэтага абавязковага правіла не дрытрымліваюцца. І таму зусім не дзіўна, што тут былі выпадкі, калі ў час валкі забіваліся коні ўласнага абоза.

Пры мехпункце ёсць перасовачная электрастанцыя, але скарыстоўваецца яна дрэнна. Рабочым прыходзіцца працаваць і грузіць лес вечарам, у цемнаце.

У лесе ніколі не бывае не толькі кіпячонай, але і звычайнай вады. Лесарубы кідаюць працу і ідуць за кілометр напіцца. Ніхто не клапоціцца аб стварэнні добрых жыллёвых умоў. У інтэрнаце нячыста. Чырвоны куток заўсёды закрыты, і рабочым няма дзе адпачыць, культурна правесці свой вольны ад працы час.

Начальнік пункта т. Карасік і старшыня рабачкома т. Красноў ведаюць пра ўсё гэта, але нічога не робяць.

М. Л. МАЛІНОЎСКІ.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

ВЫПРАЎЛЯЕМ ДАПУШЧАНЫЯ ПАМЫЛКІ

Рашэнне студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б) «Аб памылках партарганізацый пры выключэнні комуністаў з партыі, аб фармальна-бюракратычных адносінах да апеляцый выключаных з ВКП(б) і аб мерах па ўстраненню гэтых недахопаў» поўнасцю мае дачыненне да нашай Заслаўскай пагранічнай партарганізацыі. У раёне мелі месца факты няправільнага выключэння з партыі чэсных комуністаў, бяздушнага, бюракратычнага падыходу да разгляду апеляцый выключаных.

Так, напрыклад, Анусінская пярвічная партарганізацыя (парторг тав. Ліхчанка) складалася з трох членаў і двух кандыдатаў партыі. На сходзе 18 студзеня 1937 г. комуністы абмяркоўвалі партыйнасць двух таварышаў. Старшыню калгаса «Герой працы», члена партыі тав. Парфененка і радавога калгасніка, кандыдата партыі тав. Ліпуціна абвінавачвалі ў сувязях з ворагамі, у развале калгаса. Замест дэтальнай праверкі «кампраметуючых матэрыялаў», партарганізацыя, прыкрываючыся паказной пільнасцю, выключае тт. Парфененку і Ліпуціна з партыі. Райкомам партыі ўстаноўлена, што абвінавачанні беспадстаўныя, і таварышы адноўлены ў радах партыі.

На члена партыі начальніка чыгуначнай станцыі Радашковічы тав. Башмакова паступае паклёпніцкая заява аб яго сувязях з ворагамі. На аснове гэтых матэрыялаў чыгуначная пярвічная партарганізацыя выключае тав. Башмакова з партыі. Самастрахоўшчыкі, каб казырнуць рэволюцыйнай пільнасцю, прад'яўляюць яго жонцы — комуністцы тав. Башмаковай абвінавачанне ў сувязі з сваім мужам. Яе таксама выключаюць з радоў партыі. Першы раз райком праштампаваў рашэнне пярвічнай партарганізацыі. І толькі пасля рашэння студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б) матэрыял быў грунтоўна праверан і ўстаноўлена іх поўная невіноўнасць. Тт. Башмаковы зараз адноўлены ў партыі.

Старшыню Шаршунскага сельсовета комуніста тав. Астроўскага пярвічная партарганізацыя абвінавачвала ў сувязях з ворагам. Такія цяжкія кампраметуючыя матэрыялы прад'яўлены былі тав. Астроўскаму на падставе адной заявы. Яе палічылі непатрэбнай нават правяраць, а для самастрахоўкі выключылі яго з партыі. Пасля праверкі ўстаноўлена, што абвінавачанне в'яўляецца надуманым, і тав. Астроўскі поўнасцю рэабілітаван, адноўлен у партыі.

У жніўні 1937 г. члену партыі тав. Сіляве пярвічная партарганізацыя РВК выказала палітычнае недавер'е. На сходзе комуністка т. Шулякоўская выступіла з паклёпніцкім сцвярджэннем, што яна калісь бачыла памешчыка, які падобны на тав. Сіляву. Яна даказвала членам і кандыдатам партыі, што ўсе рысы твару тав. Сілявы пераканаўча сходзяцца з вядомым ёй памешчыкам. Гэтаму наіўнаму выступленню паверылі, і тав. Сілява выключылі з партыі і знялі з работы.

Некалькі месяцаў тав. Сілява даказваў сваю невіноўнасць. Аднак яму не верылі. Толькі ў апошні час, пасля Пленума ЦК ВКП(б), выяўлена паклёпніцтва на чэснага комуніста і ён адноўлен у партыі.

Гэтымі днямі адбыўся раённы партыйны сход, які абмяркоўваў гістарычнае рашэнне студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б). Комуністы ў выступленнях рэзка крытыкавалі райком партыі за дапушчаныя грубыя памылкі пры выключэнні з партыі асобных комуністаў. Таварышы адзначалі, што ў партарганізацыі існавалі абураючыя адносіны да апеляцый выключаных. У райкоме фармальна, бюракратычна падыходзілі да праверкі кампраметуючых матэрыялаў, якія паступалі на асобных комуністаў. Такім чынам, дзесяткі чэсных членаў і кандыдатаў з'явіліся афярай самастрахоўшчыкаў, паклёпнікаў і комуністаў-кар'ерыстаў.

У прынятай пастанове сход патрабаваў ад райкома партыі неадкладна перагледзець усе справы няправільна выключаных з партыі. Райкомам разгледжана 28 апеляцый. 12 таварышаў адноўлены ў радах партыі. Не разгледжаны толькі 4 апеляцыі. Кожную з іх мы ўсебакова правяраем, глыбока вывучаем, каб выносіць правільнае, большэвіцкае рашэнне.

Гістарычнае рашэнне студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б) узбройвае кожнага большэвіка на яшчэ большую рэволюцыйную пільнасць, каб да канца выкрыць замаскаваўшыхся ворагаў. Наносячы сакрушаючыя ўдары па сапраўдных ворагах, выпраўляючы з большэвіцкай праматой дапушчаныя памылкі, мы вернем у свае рады няправільна выключаных з партыі, дапаможам ім уключыцца ў актыўную барацьбу за комунізм.

Д. А. КАРАТКЕВІЧ,
сакратар Заслаўскага райкома партыі.

МАСАВЫЯ КУРСЫ АГІТАТАРАЎ

Па ўказанню ЦК КП(б)Б у гарадах і раёнах БССР праводзяцца масавыя 10-дзённыя курсы агітатараў. Слухачы курсаў — гэта ў асноўнай сваёй масе таварышы, якія ўпершыню ўключыліся ў агітацыйную работу ў перыяд падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Совет СССР. У праграме заняткаў—вывучэнне пастановы студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б), Канстытуцыя БССР, лекцыі па пытаннях міжнароднай палітыкі, аб каварных метадах работы замежных разведак і т. д. У Гомелі і Бабруйску курсы першага склікання ўжо закончылі сваю работу. Імі было ахоплена 200 агітатараў. Таксама закончыліся заняткі на курсах у Петрыкаве і ў радзе іншых раёнаў рэспублікі. На працягу лютага-сакавіка на курсах будзе падрыхтавана 4.270 агітатараў.

ВЫРАС БЕСПАРТЫЙНЫ АКТЫЎ

КАМАРЫН. Пасля сканчэння выбараў райком партыі вылучыў лепшых беспартыйных актывістаў на адказную кіруючую работу. Даярка калгаса імя Кірава, лепшая стаханаўка т. Навозенка Ольга, якая ў час выбарчай кампаніі была актыўным агітатарам, выбрана старшынёй В.-Жараўскага сельсовета. Звеннявая стаханаўка калгаса «Новая праца» тав. Шаўчэнка Марыя, якая была членам участковай выбарчай камісіі, вылучана загадчыкам ДСК у Радзінскім сельсавеце. Актывіст выбарчай кампаніі тав. Малочка Я. Д. вылучан загадчыкам райана. Радавы калгаснік тав. Сіманенка выбран старшынёй калгаса імя Кірава, а калгаснік тав. Жораў выбран старшынёй Лукаедаўскага сельсовета. Брыгадзір калгаса тав. Малевіч А. выбран старшынёй калгаса «Чырвоны барацьбіт».

Г. БАЯРАЎ

Каланіяльныя патрабаванні фашысцкай Германіі

Германскі фашызм в моманту выхаду Германіі з Лігі нацый ставіў адной з абавязковых умоў свайго супрацоўніцтва ў Лізе — зварот ёй страчаных у імперыялістычную вайну калоній.

Палітыка пагаднення з агрэсарам, якая характарызуе ўвесь сучасны знешнепалітычны курс Англіі, распаліла апетыты агрэсара. Паездка лорда Галіфакса ў канцы лістапада 1937 года ў Берлін і яго інтымная гутарка з Гітлерам, у якой апошні прапанаваў свае вядомыя «шэсць пунктаў» узрыву міру, высунутыя ім умовы пагаднення з Англіяй, і спачувальныя адносіны да іх з боку высокага лорда, бясспрэчна, аказалі ўплыў на далейшую актывізацыю агрэсіўных сіл у Еўропе.

Пры гэтым агрэсары разлічваюць, як і раней, на чарговы прыступ страху ў Англіі і на ўступкі з яе боку. Не выпадкова, што Італія і Германія заража пасля візіту Галіфакса ў Берлін пачалі падрыхтоўку да шырокага паходу супроць Лігі нацый. Пачалося з таго, што 11 снежня мінулага года Мусаліні дэкларараваў выхад Італіі з Лігі нацый, 12 снежня Гітлер заявіў, што з выхадам Італіі з Жэневы Германія назаўсёды знімае пытанне аб магчымасці яе звароту ў Лігу. Далей ідуць спробы ўзарваць Лігу нацый з сярэдзіны. Сюды адносіцца спроба ўздзейнічаць на Аўстрыю і Венгрыю з боку Мусаліні — прымусіць іх узяць прыклад з Італіі і пакінуць Лігу нацый. Гітлер спецыяльна інструктуе свайго «каміважэра» палкоўніка Бэка перад яго паездкай у Жэневу на 100-ю сесію Совета Лігі нацый. Нарэшце, паводзіны Польшчы і так званых «нейтральных» краін у Жэневе, — усё гэта сведчыць аб узмацніўшайся актыўнасці агрэсараў.

Усе гэтыя факты з'яўляюцца звеннямі аднаго ланцуга — планамернай падрыхтоўкі развязвання новай сусветнай вайны.

Гэтыя-ж мэты праследуюць і каланіяльныя патрабаванні Італіі і Германіі.

У апошні час каланіяльная прапаганда ў Германіі рэзка ўзмацнілася. Ва ўсіх прамовах кіраўнікоў германскага фашызма закранаецца каланіяльная праблема. Па ўсёй краіне праводзяцца спецыяльныя сходы, прысвечаныя каланіяльным патрабаванням. У навучальных установах уводзяцца спецыяльныя курсы лекцый па каланіяльных пытаннях. Газета «Дэйтшэ фолькс-дэйтунг», якая выходзіць у Парыжы, у адным з сваіх апошніх нумароў паведамляе, што «амаль ва ўсіх кніжных магазінах можна бачыць карты свету, на якіх былыя германскія калоніі паказаны, як частка тэрыторыі Германіі».

Перадача міністэрства замежных спраў фашысцкаму «звышдыпламату» Рыбентропу, стараннаму праваднику каланіяльных патрабаванняў Германіі, надае ў сучасны момант гэтым патрабаванням асабліва агрэсіўны характар.

Калі раней выступленні кіраўнікоў германскага фашызма з каланіяльнымі патрабаваннямі абмяжоўваліся толькі палемікай з англійскай і французскай прэсай аб абгрунтаванасці «патрэб» Германіі ў калоніях, то цяпер тон гэтых выступленняў рэзка змяніўся. Бясспрэчна, гэта знаходзіцца ў прамой залежнасці ад вядомай згоды Германіі і Італіі аб узаемным падтрыманні іх каланіяльных дамаганняў, а таксама ад палітыкі заходнееўрапейскіх дзяржаў, якія патураюць агрэсарам.

«Дэйтшэ фолькс-дэйтунг» паведамляе, што нядаўна ў Аахене выступіў кіраўнік акруговай фашысцкай арганізацыі Р. Шалер. Ён заявіў: «Тры гады назад мы не маглі нават гаварыць аб звароце калоній. Цяпер мы гаворым аб гэтым адкрыта. Мы ўзбройваемся і заяўляем, што будзем узбройвацца і далей. І калі нам не аддадуць нашы калоніі добраахвотна, мы пашлем туды нашы войскі. Хаця калоніі для нас і не маюць асаблівай вартасці, мы ўсё-ж ад іх не адмовімся».

Фашысцкі агітатар у парыве ваяўнічага экстазу выбалбатаў больш, чым яму належала па інструкцыі міністэрства прапаганды.

У якасці галоўнага аргумента, абгрунтоўваючага патрабаванні звароту Германіі яе былых калоній, кіраўнікі фашызма выстаўляюць «перанаселенасць» Германіі і яе «беднасць» у сыравіне і харчах. Пры гэтым у афіцыяльных прамовах заўсёды падкрэсліваюцца сыравінныя і харчовыя багацці былых германскіх калоній. Але гэта робіцца пераважна ў мэтах унутранай палітыкі.

Цынізм германскага фашызма не ведае межаў. Давёўшы германскі народ да сапраўднага голаду, фашызм скарыстоўвае цяпер цяжкое становішча працоўных мас у мэтах прапаганды звароту калоній, у мэтах падрыхтоўкі новай вайны. Так, восенню 1937 года Гітлер на «свяце» ўраджаю ў Бюкебергу заявіў, што «Германія не можа пракарміць германскі народ на сваёй зямлі», а таму ёй неабходны калоніі.

Спекуляцыя на цяжкім становішчы працоўных мас Германіі стала ўлюбёным прыёмам верхаводаў фашызма. У гэтым-жа духу пішуцца і інструкцыі міністэрства прапаганды для фашысцкіх прапаведнікаў.

Довад аб «перанаселенасці» Германіі не вытрымлівае ніякай крытыкі. Да імперыялістычнай вайны 1914—18 гг. Германія, як каланіяльная імперыя, існавала каля 30 год. І за гэты час яна змагла пасяліць у сваіх былых калоніях вельмі нязначную колькасць немцаў. Наколькі гэта колькасць мізэрная, відаць хоць-бы з наступнай таблицы, запазычанай намі з журнала «Дзі нейе Вельдбюне»:

Былыя германскія калоніі	Плошча ў тыс. кв. кілометр.	Агульн. колькасць жыхароў у тысячах	У тым ліку немцаў у тысячах
Того	87	1032	0,3
Камерун	790	2649	1,6
Паўдн.-Зах. Афрыка	835	81	12,3
Усходн. Афрыка	995	7646	4,1
Новая Гвінея	241	600	1,0
Самоа	2,6	35	0,3
Кіао-Чао	0,6	187	4,3
	2951,2	12230	23,9

Такім чынам, на дванаццаць з лішнім мільёнаў тубыльнага насельніцтва ў былых германскіх калоніях было паселена за 30 год, уключаючы і ваенныя гарнізоны, усяго толькі 23,9 тысяч немцаў, г. зн. менш, чым пражывае немцаў у Парыжы. За гэтыя-ж 30 год насельніцтва Германіі вырасла з акруглення на 20 мільёнаў.

Довад аб неабходнасці калоній для снабжэння метраполіі нехапаючай сыравінай і харчаваннем таксама негрунтоўны. Характэрна, што да вайны, па даных, апублікаваных у журнале «Дзі нейе Вельдбюне», гандаль Германіі са сваімі калоніямі прадстаўляўся ў такім выглядзе:

Знешні гандаль 1913 года ў мільёнах марак:

	Увесь абарот знеш. гандлю Германіі:	Гандаль з калоніямі:	У процантах:
Увоз	11054	58	0,05
Вываз	10891	57	0,05

З калоній Германія вывозіла каўчуку ў колькасці 1/9 сваёй патрэбнасці, а бавоўны — усяго толькі 1/222 сваёй патрэбнасці. Не больш яна вывозіла і прадуктаў харчавання — усяго толькі 1/200 патрэбнасці краіны. З таго часу становішча амаль не змянілася.

Германія ўвозіла раней і ўвозіць цяпер асноўную сыравіну і харчы не з каланіяльных уладанняў, а пераважна з суверэнных дзяржаў. Недахват-жа ў сыравіне і харчах, які сапраўды перажывае Германія, тлумачыцца не адсутнасцю ў яе калоній, а палітыкай шалёных ваенных падрыхтаванняў, паглынаючай усе матэрыяльныя багацці краіны.

Але «сыравінны» і «харчовы» аргумент у каланіяльных патрабаваннях Германіі мае вельмі пэўны сэнс і напрамак. Гутарка ідзе галоўным чынам не аб былых германскіх калоніях, а аб перадзеле свету, пры якім германскі фашызм прэтэндуе на львіную долю цяперашніх каланіяльных уладанняў Англіі, Францыі, Бельгіі, Іспаніі, Галандыі і іншых краін. Вось што па сутнасці хаваецца за гэтым «бяскрыўдным сыравінным» аргументам.

У каланіяльных патрабаваннях ёсць аргумент, які не адважваюцца прыводзіць у афіцыяльных прамовах фашысцкія палітыкі, але наяўнасць якога падкрэсліваецца ўся перадваенная гісторыя каланіяльнай палітыкі германскага імперыялізма. Справа ідзе аб стварэнні апорных пунктаў для рыхтуемай вайны за агульны перадзел свету. І гэту акалічнасць не шкодна было-б прадумаць некаторым англійскім дыпламатам, у якіх час адшыб памяць.

Германія-ж да пачатку вайны 1914—18 гг. уладала тымі-ж самымі калоніямі, аб якіх яна так клапоціцца ў сучасны момант. Але гэта ніколькі не зрабіла германскі імперыялізм больш міралюбівым. Вядома, што германскія імперыялісты, у свой час параўноўваючы свае калоніі з каланіяльнымі ўладаннямі Англіі і Францыі, называлі іх «тэрытарыяльнымі адкідамі». Яны і тады ставілі сваёй задачай перадзел свету.

Торг аб калоніях, які вядзе Англія з правіцелямі сучаснай Германіі, распіваецца фашысцкіх агрэсараў. Гісторыя афяравала чужымі тэрыторыямі ў мэтах захавання сваіх уласных. У даным выпадку яна можа прабаваць паўтарыць гэту ігру. Але за патуранне агрэсараў у каланіяльным пытанні будзе расплачвацца ў першую чаргу сама Англія.

Працоўныя масы Германіі, зацікаўленыя ў міры, разумеюць, што каланіяльныя дамаганні германскага фашызма накіраваны на развязванне вайны.

Германскі народ добра ведае, што калоніі ў Германіі — гэта новы падатковы цяжар. Прыклад італьянскага фашызма ў даным выпадку вельмі характэрны.

Антыфашысцкая нямецкая газета «Дэйтшэ фолькс-дэйтунг» наступнымі словамі выказала сапраўдныя настроі працоўных мас Германіі: «Мы змагаемся за тое, каб сыравінныя і харчовыя труднасці ў Германіі былі ліквідаваны шляхам мірнай гаспадарчай палітыкі, шляхам палітыкі мірнага супрацоўніцтва з дэмакратыяй Захаду і перш за ўсё з Совецкім Саюзам.

Мы адчуваем сябе цесна звязанымі з барацьбітамі за свабоду каланіяльных народаў, супроць імперыялізма буйных капіталістычных краін. Таму патрабуем мы, таму змагаемся мы за наш лозунг: няма калоній для германскага фашызма».

МУЖНЫЯ ВАРТАВЫЯ СОВЕЦКІХ ГРАНІЦ

На сляду парушальніка. Заходняя граніца СССР. Фото С. Грына.

ПАГРАНІЧНІК СМАГІН

Ноч... Бушуе мяцеліца. Вялікія клочы снегу, падганяемыя парывамі ветру, паляць твары пагранічнікаў, прытаіўшыхся ў лесе. Лес шуміць.

Ноч — зручны час для парушальніка, асабліва ў такое надвор'е, калі сляды заносяцца снегам, а свіст ветра заглушае ўсякі іншы шум. Аб гэтым ведае кожны з нарада. Позіркі ўсіх накіраваны туды, дзе праходзіць граніца.

Да раніцы снежная мяцеліца пачала крыху сціхаць. Па дарозе на заставу прывычнае вока совецкіх вартавых заўважыла на снезе свежы след. Граніца парушана. Адважыўшыхся гэта зрабіць трэба дагнаць і затрымаць.

Цэлы дзень два пагранічнікі праследвалі па слядах парушальнікаў. Снежны пыл хлястаў у твар, людзі ўтапалі ў сугробах.

40 кілометраў цяжкага шляху асталося ззаду, але след усё яшчэ не разблытваўся. У аднаго з паселішчаў ён раптоўна абарваўся. На дапамогу прышлі сяляне, якія ўказалі пагранічнікам шлях следвання парушальнікаў.

Абодва пагранічнікі прыкметна слабелі. Задыхаючыся, яны беглі да таго часу, пакуль, выбіўшыся з сіл, спыніліся. Парушальнікі ўцякалі. Але гэтага нельга дапусціць. Праследванне прадаўжаў адзін пагранічнік тав. Смагін.

Шлем паліў Смагіну галаву, кажух здаваўся дзесяціпудовай ношай. Падбітыя двайной падмёткай цяжкія чырвонаармейскія боты з кожным крокам павялічваліся ў вазе. Сілы пакідалі яго. Прышлося скінуць кажух. Праз гадзіну, калі снежная мяцеліца вусім сціхла, Смагін убачыў наперадзе сябе, на адлегласці двух кілометраў, групу людзей, якія паспешна ўходзілі ў горы.

Быстра зняўшы боты і абматаўшы ногі парцянкамі, ён кінуўся наперад за парушальнікамі. Дагнаўшы іх, пагранічнік громка крыкнуў: «Стой!» У адказ раздаліся выстралы. Укрыўшыся паміж двух каменняў, Смагін смела ўступіў у бой з пяццю ўзброенымі парушальнікамі.

Кулі снайпера Смагіна прыкавалі да зямлі траіх з іх. Адзін быў забіт напавал. Астатнім, разгубіўшымся, Смагін скамандаваў: «Лажыся!»

Загад пагранічніка быў выканан. Прыбыўшыя на дапамогу таварышы дапамаглі даставіць парушальнікаў на заставу.

Бясстрашны патрыёт, верны сын свайго народа, пагранічнік Смагін за беззаветную храбрасць і самаадданасць узнагароджан каштоўным падарункам.

ПАТРЫЁТЫ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РАДЗІМЫ

Тысячы лепшых сыноў шчаслівага совецкага народа — нашых слаўных пагранічнікаў стаяць на варце мірнай працы грамадзян СССР, ахоўваюць недатыкальнасць чырвоных рубяжоў.

Мужныя чэкісты-пагранічнікі не адзін раз даказалі, што граніцы краіны соцыялізма на магутным сталінскім замку, і як-бы вораг ні ўхітраўся, яму не пралезці праз совецкі рубеж.

Недатыкальнасць совецкіх граніц грунтуецца на сіле нашай гераічнай Чырвонай Арміі, на няўсыпнай пільнасці совецкіх пагранічнікаў, на несакрушальным адзінстве вялікага совецкага народа. За нашымі пагранічнікамі стаяць мільёны грамадзян СССР. Працуючы кожны на сваім участку, яны дапамагаюць пагранічнікам ахоўваць любімую соцыялістычную радзіму.

Працоўныя пагранічных раёнаў затрымалі нямала парушальнікаў совецкай граніцы. Дзесяткі лепшых памочнікаў чырвоных пагранічнікаў узнагароджаны ордэнамі Саюза ССР. Многія калгаснікі атрымалі каштоўныя падарункі ад наркома ўнутраных спраў СССР, вернага саратніка вялікага Сталіна таварыша Ежова...

НА ЗАСТАВЕ

Змястоўным і багатым жыцём запоўнены баявыя будні пагранічнай заставы, якую ўзначальвае лейтанант Сокалаў. У ясныя дні і цёмныя ночы, у спякотнае лета і сцюдзёнай зімой стаяць пагранічнікі на варце совецкіх рубяжоў. Ні адзін вораг не пройдзе праз нашу граніцу непакараным. Многа гераічных эпізодаў упісалі пагранічнікі заставы лейтэнанта Сокалава ў гісторыю барацьбы за недатыкальнасць совецкіх рубяжоў.

Побач з баявой работай байцы і камандзіры авалодваюць тэхнікай, павышаюць свае агульнаадукацыйныя і палітычныя веды. Застава — не толькі школа мужнасці, геройства, знаходлівасці, але і агульнаадукацыйная школа.

Часта гадзіны напружанай вучобы і адказнейшай работы па ахове граніцы змяняюцца незабыўнымі вясёлымі мінутамі адпачынку.

Комсорг Выбарнаў — ініцыятар самадзейнасці і арганізатар вольнага часу байцоў мабілізуе ўсе культурныя сілы заставы. Пагранічнік Халопаў — танцор і запявала — выводзіць на сцэну свой самадзейны калектыў зацейнікаў, танцораў. Іх змяняе на сцэне струнны гурток.

Льюцца гукі песень аб вялікім Сталіне, аб любімым Варашылаве, «Аб радзіме», далёка разносіцца «Марш вясёлых рэбят». Запявалы Кабушко, Вараб'ёў, Міхайлаў і Халопаў карыстаюцца вялікім поспехам у байцоў. Чутны бадзёрыя песні пагранічнікаў і за совецкім рубяжом.

На заставе ёсць уласны драматычны гурток. Пагранічнікі з поспехам ставяць п'есы аб граніцы. Нядаўна паставілі на сцэне п'есу «Мядзведзя» А. Чэхава, зараз рыхтуюць пастаноўку аб героях-лётчыках — «Таварышы». Знатны пагранічнік Халастых вядомы не толькі ватрыманнямі шпіёнаў і атрыманай ад наркома узнагародай, але і як лепшы артыст заставы.

Драматычны гурток трымае шчыльную сувязь з бліжэйшым калгасам. Часта драмгурткі калгаса і заставы абменьваюцца спектаклямі. Калгаснікі глядзяць пастаноўкі пагранічнікаў, а калгасны драмгурток, у сваю чаргу, паказвае свае поспехі на сцэне заставы. Калгасніцы Філіповіч Анна, Райнік Соф'я і настаўніца Іванова Каця прымаюць актыўны ўдзел у гуртку пагранічнікаў.

Сувязь з калгасам не абмяжоўваецца толькі гэтым. Паміж заставай і калгасам існуе моцная дружба і ўзаемадапамога. Пагранічнікі Кунін Пётр і Сініцкі Андрэй кіруюць у калгасе палітгуртком. Пры іх дапамозе калгаснікі вывучаюць матэрыялы Сесіі Вярхоўнага Совета СССР і рашэнні студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б). Баец Бударын Якаў кіруе вайсковым гуртком пры калгасе.

Ф. К.

Пагранічнік у дазоры. Заходняя граніца СССР. Фото С. Грына.

НАЧНЫ „ГОСЦЬ"

Евеліна Іосіфаўна Кісель, разбудзіўшы заначаваўшую ў яе суседку Ядвігу Гарстовіч, збіралася да прыгараднага поезда, каб паехаць у Менск.

— Мама, — спалохана прашаптаў на вуха 8-гадовы Іосіф, — нехта крычыць пад акном...

Евеліна вышла на двор...

— Што вам трэба? — звярнулася яна да незнаёмага мужчыны, які стаяў ля акна.

— Я іду к поезду, але збіўся з дарогі. Пакажыце мне, калі ласка, як прайсці на станцыю.

— Мы таксама збіраемся к поезду, пачакайце крыху, разам пойдзем, — адказала тав. Кісель.

Невядомы згадзіўся і зайшоў у хату.

Завёўшы гутарку, Евеліна пераканалася, што незнаёмы не з мясцовых жыхароў. Яго ўзбуджэнне выклікала ў тав. Кісель пэўную падазронасць.

Выбраўшы зручны момант, Евеліна паслала сваіх сыноў Іосіфа і Стасіка да дырэктара соўгаса, а сама з суседкай і «гасцём» пайшлі ў напрамку да станцыі.

— Дзе-ж вашы дзеці? — запытаў невядомы, заўважыўшы іх адсутнасць.

— Пайшлі разбудзіць нявестку, — супакоіла яго Евеліна, — яна таксама збіраецца паехаць у Менск.

— Ці хутка паша? Ці далёка да станцыі? — цікавіўся невядомы. Але Евеліна і Ядвіга, не адказваючы на пытанні, гутарылі пра розныя гаспадарчыя дробязі...

Прышоўшы да нявесткі, Евеліна папярэдзіла яе аб падазроным спадарожніку і прапанавала як мага далей зацягваць гутарку і зборы.

Евеліна «хвалявалася» з-за адсутнасці дзяцей, «падштурхоўвала» непаворотлівую нявестку і супакойвала неваротлівую нявестку і супакойвала невядомага, што на станцыю яшчэ рана. Тым часам у пакой увайшоў вартаўнік соўгаса са стрэльбай, а праз хвіліну прышлі дырэктар соўгаса, бухгалтар і двое рабочых.

— Вашы дакументы! — звярнуўся дырэктар да незнаёмага.

Зрабілі вобыск і знайшлі рэвальвер сістэмы «наган», 2520 руб. грошай і компас. Парушальніка адвялі ў канцылярыю соўгаса, а праз некалькі хвілін туды прыехалі чырвоныя пагранічнікі.

Затрыманы аказаўся буйным агентам замежнай разведкі.

МУЖНЫ ЎЧЫНАК БРЫГАДЗІРА

Зусім нядаўна брыгадзір калгаса «Полымя» тав. Нагорны Міхаіл затрымаў на дарозе незнаёмага чалавека. Незнаёмы прад'явіў пашпарт і іншыя дакументы жыхара г. Марыупаля і расказаў, што прыехаў у г. Менск па справах, але заблудзіўся і трапіў сюды (у калгас ля самай граніцы (!?).

Не гледзячы на ўгаворы і просьбы адпусціць яго, не гледзячы на прапанаваную буйную суму грошай, Нагорны даставіў незнаёмага ў сельсавет і адтуль у пагранатрад.

«Заблудзіўшыйся марыупалец» аказаўся буйным агентам замежнай разведкі, перапраўленым праз граніцу для шпіянажа і дыверсіі. Ён быў узброен наганам, атрутнымі матэрыямі, меў падробленыя дакументы.

У САКРЭЦЕ

Выбіраючы месца для сакрэта, пагранічнікі Васіль Фралоў і Арсеній Прыбылёў былі ўпэўнены у правільнасці свайго рашэння. Размясціўшыся на ахоўваемым участку граніцы і добра замаскаваўшыся, яны чутка прыслухоўваліся да начных гукаў.

Ляжаць прышлося нядоўга. Неўзабаве з боку граніцы ціха хруснуў хмызняк. Пагранічнікі настаражыліся. Іх вочы, прывыкшыя да цемры, добра разлічалі бліжэйшыя сілуэты дрэў. Сярод іх ледзь бачна вырысоўваўся сілуэт парушальніка. Ен асцярожна рухаўся на сакрэт.

У роках за дзесяць ад пагранічнікаў парушальнік спыніўся, прыслухоўваючыся да шорахаў ночы. Не заўважыўшы нічога падазронага, ён зноў асцярожна рушыў наперад. Падпусціўшы парушальніка на блізкую адлегласць, пагранічнікі заўважылі ў яго выцягнутай руцэ наган. Адзін неасцярожны рух мог закончыцца трагічна для байцоў.

Пагранічнікі прапусцілі парушальніка міма сябе. І адразу ціхім, але грозным воклічам — «Стой!.. Рукі ўгору!» — канчаткова збянтэжылі яго. Ад нечаканасці вокліча парушальнік выпусціў з рук наган.

Таксама-ж ціха абязброены парушальнік быў канваіраван на заставу. У працэсе следства ён аказаўся мацёрым шпіёнам адной з замежных разведак.

М. БРОНЬ.

У дазоры. Фото-эцюд С. Грына.

ГРАНІЦА НА ЗАМКУ

Служыць у войсках пагранаховы, ахоўваць граніцы нашай слаўнай радзімы здаўна было маёй марай. У 1934 годзе маё жаданне збылося. У часе прызыву я, малады кіеўскі рабочы, быў залічан у войскі пагранаховы і накіраван для аховы заходняй граніцы.

Праз некалькі месяцаў камандаванне часці накіравала мяне ў школу малодшых камандзіраў. Тут я вывучаў ваенную тэхніку, павышаў свой палітычны ўзровень, прымаў актыўны ўдзел у грамадскай рабоце. Мяне выбралі комсоргам школы, адначасова я в'яўляўся арганізатарам палітгрупы. Пасля сканчэння школы быў малодшым камандзірам, а ў 1937 годзе мяне атэставалі на сярэдняга камандзіра. У гэтым годзе я прынят у кандыдаты партыі.

Працуючы над сабой, я ўвесь час дапамагаю сваім таварышам па вучобе і рабоце. Зараз маё падраздзяленне мае нядрэнныя поспехі ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы. Байцы майго падраздзялення тт. Заднепральны, Сліўко, Качарга, Андручэнка, Гарбанос і іншыя прышлі ў армію малапісьменнымі, не чыталі кніг і газет, а зараз яны з'яўляюцца перадавымі байцамі, пільнымі вартавымі совецкіх граніц. Не аднаго парушальніка граніцы яны затрымалі.

Працаваць па выхаванню маладых байцоў, ахоўваць граніцы нашай радзімы, не дапусціць праз мяжу ні аднаго дыверсанта і шпіёна — ганаровая, адказная задача. Вось чаму службу на граніцы я выбраў сваёй пажыццёвай прафесіяй. Я шчасліў, што выконваю баявое заданне партыі і ўрада — трымаць граніцу на моцным сталінскім замку.

Александр САМАХВАЛАЎ,
камандзір-пагранічнік. (К. П.).

Ів. ШАПАВАЛАЎ

НА СНЯГУ—СЛЯДЫ

(Апавяданне)

Вось ён неяк бокам сядзіць перад начальнікам заставы, зябка ёжачыся, уздрыгваючы, бязмэтна разгладжваючы нервовымі вузлаватымі пальцамі левай рукі складкі брук. Правая рука яго вісіць на бінтавой павязцы і нагадвае велізарную кукалку нейкай гусеніцы. Пахудалы твар, з калючай шчацінай даўно не брытай барады, нічога не выражае. Толькі глыбока запаўшыя вочы няпэўнага колеру быстра бегаюць па акружаючых прадметах, старанна ўнікаючы сустрэчы са спакойным, крыху стомленым поглядам пагранічніка.

На другім канцы стала акуратна складзены два «парабелюма», граната, старанна завёрнуты ў станіёлевую і папіросную паперку запал да яе, стопка абойм з патронамі, стопка чырвонцаў трыццаціпрублёвай вартасці, два «совецкіх» пашпарты, компас, тапаграфічная карта, скрыначка са стрыхнінам. На ўсе бандыцкія аксесуары, якія ператварыліся цяпер у рэчавыя доказы, начальнік заставы склаў вопіс і ўважліва разглядае іх былога ўладальніка.

Размерна цікае гадзіннік на сцяне. Начальнік заставы зірнуў на цыферблат: дваццаць мінут пятага. Другія суткі ён не змыкаў вачэй. Затое... вось рэзультаты.

І пагранічнік спакойна аглядае з ног да галавы седзячага перад ім чалавека, потым пераводзіць вачыма на зброю і яд. Іх нёс гэты чалавек. Нёс, зразумела, не для таго, каб яны апынуліся на стале Н-скай пагранічнай заставы. І начальнік, і той, хто перад ім, добра ведаюць прызначэнне гэтых рэчаў.

Начальнік заставы зноў пераводзіць позірк на затрыманага. Той рэзка адкідваецца на спінку крэсла, і цяпер на пагранічніка ва ўпор глядзяць мутныя ненавідзячыя вочы ворага. Крыху памаўчаўшы, начальнік заставы прадаўжае часова спынены разгавор:

— І так, вы дакладней не хочаце сказаць навошта вы ішлі, да каго ішлі, хто дапамог перайсці граніцу?

— Навошта ішоў?.. — Парушальнік тупа глядзіць у бок, потым ажыўляючыся, адказвае пытаннем-жа: — А навошта вы ахоўваеце граніцу? — І твар яго крывіцца на манер ўсмешкі, якая больш нагадвае грымасу.—Мы-ж ваюем... З вамі, паны... пагранічнікі.

— Так, мы ваюем. Ну што-ж, я разумею, адразу вам усё сказаць цяжка,—пагранічнік весела ўсміхаецца, — у вас будзе дастаткова часу і падумаць, і ўспомніць, і расказаць...

Ён дзёргае ручку званка. У дзвярах з'яўляецца дзяжурны па заставе. — Праводзьце затрыманага, — звараачаецца да яго начальнік заставы.

Дзяжурны спакойна адказвае: — Есць праводзіць, — і, адсцягнуўшы кабур рэвальвера, уводзіць цяжка ступаючага бандыта. Начальнік заставы яшчэ раз правярае рэчавыя доказы з вопіссю, закручвае іх у паперу, апячатвае пакет і, напісаўшы адрас, закрывае ў незгараемую скрынку. На світанні ён гэты пакет разам з затрыманым накіруе па назначэнню.

Закрыўшы, начальнік заставы садзіцца пісаць данясенне аб затрыманні. Абмакнуўшы пяро ў чарнільніцу, ён мінуту сядзіць нерухома, павольна выпускаючы дым праз вугал роту, потым спакойна пачынае пісаць:

«...Вартавымі па ахове дзяржаўнай граніцы былі выяўлены сляды на снежным пакрове...»

... Нараджаюцца з-пад пяра скупыя радкі, расказваючыя аб гераічных справах.

***

Патрэсквалі ад марозу дрэвы. А тут яшчэ вецер разгуляўся з вечара. Агнём апальвае твар, вые вецер, вочы заляпляе снегам. Усім корпусам падаўшыся наперад, павольна пратаўкваюцца скрозь струменні марознага паветра два пагранічнікі. Вінтоўкі зацісніуты падмышкай. Рукі ў шарсцяных рукавіцах сціскаюць цэв'ё зброі. Рукі, вядома, мёрзнуць, але тут ужо нічога не зробіш, і пагранічнікі варушаць пальцамі, каб крыху іх атагрэць.

Часамі адзін з пагранічнікаў нізка прыгінаецца да снегу, уважліва ўглядаецца ў нейкую, толькі яму прыкметную плямку, і, пераканаўшыся, што нічога падазронага няма, абодва прадаўжаюць шлях. Часам яны спыняюцца, чутка прыслухоўваюцца да вою ветру, углядаюцца ў мутныя сілуэты дрэў, хмызняку. Ім краіна даверыла гэты маленькі ўчастак сваёй граніцы. Яны расшукваюць на ім ворага. Калі вораг гэты паспрабуе сунуцца, яны яго безумоўна затрымаюць. Калі сёння на іх участку вораг не пойдзе, яны, прышоўшы на заставу, упэўнена дакладуць начальніку, што «за час нясення службы на даверaным ім участку дзяржаўнай граніцы ніхто не прайшоў»...

Чаму яны абодва так уважліва ўглядаюцца ў снег?

— След! Недарэчны нейкі..

— Бачу. Ці задам-наперад ішоў, ці на каленях.

Рашэнне прымаецца хутка. Праз поўгадзіны на месца выяўлення следу ужо прыбыў начальнік заставы і праваднік з сабакам. Сабака панюхаў след і ірвануўся ў тыл, уцягваючы за сабой правадніка. Начальнік заставы і прыбыўшы з ім пагранічнік стараліся не адставаць ад яго. Вецер шалёна біў у твар, перашкаджаючы ісці, слепячы вочы..

Начальнік заставы роўна, глыбока дыхаючы, ішоў за праваднікам наперакор ветру і мяцеліцы, прасоўваючы сваё моцнае цела ўсё наперад і наперад. У валенках у яго было поўна снегу. Мозг працаваў напружана... Застава ўключылася ў ганаровую сталінскую вахту. Гэтага яны дабіліся ўпартай, крапатлівай работай. Ні адзін вораг не павінен праскальзнуць беспакарана праз яго ўчастак... Сабака крута звярнуў у бок, пайшоў назад. Начальнік заставы спыніўся. Суправаджаючы яго пагранічнік — таксама. Сабака, прайшоўшы метраў 30, зноў ірвануў у бок, потым зноў наперад.

— Петліць, сукін сын!... А ўсё-ж мы цябе зловім, — упаўголас сказаў сабе начальнік заставы.

— Абавязкова зловім, нечакана адгукнуўся пагранічнік.

Начальнік азірнуўся, усміхнуўся і зноў закрочыў наперад. Нечакана праваднік спатыкнуўся і ўпаў. Начальнік заставы падбег да яго. Цяжка дыхаючы, пагранічнік падымаўся на ногі. У мутных сумерках досвітка начальнік заставы разгледзеў яго твар. Ён быў бледным і потным. Дыхаў ён цяжка. Начальнік заставы не заўважыў, што сам ён увесь у поце.

— Стаміліся!

— Спатыкнуўся, таварыш начальнік, — пагранічнік вінавата ўсміхнуўся і падняўся на ногі. Сабака ірваўся наперад. Чэрпаючы галянішчамі валёнак снег, пайшлі далей.

Па сляду!..

***

Ужо дзень. 10 гадзін пагранічнікі праследуюць парушальніка. Яго сляды старанна абходзяць вёскі. Яны вялі лесам, балотам, па цаліне. Мяцеліца спіхла. Мароз узмацніўся. Твары пагранічнікаў асунуліся. Дыханне было цяжкім і вырывалася клубамі белага пару, які інеем асядаў па расніцах, брывях, на шлемах і таяў ў марозным тумане. Здавалася, толькі сабака не стаміўся. Ён па-ранейшаму лёгка бег па замёрзшаму балоту, прынюхваючыся да следу. След цяпер праступаў ясна, і аказваецца, што след не адзін, а два. Ворагі, як відаць, перайшоўшы граніцу, ішлі след у след, а тут адчулі сябе ўжо ў адноснай бязапаснасці і пайшлі звычайна. Пагранічнікі забыліся пра стомленасць. Вораг быў дзесьці блізка. Раптам сабака неспакойна і няўпэўнена замітусіўся з боку ў бок. Сляды разыходзіліся. Адзін след ішоў у бок чарнеўшай на прыгорку вёскі, другі ўходзіў направа — да занесеных снегам стагоў сена на балоце. Усе на мінуту спыніліся, пытліва гледзячы на начальніка. Той моўчкі накіраваўся па следу, які вядзе да стагоў. Сабака зноў упэўнена рушыўся наперад. Раптам камандзіра быў зразумелы і ўхвален байцамі.

На секунду сабака замёр і настаражыўся, нюхаючы паветра. Праваднік адсцягнуў павадок:

— Фас! — стралою рынуўся сабака да занесенага снегам стогу, да якога вёў след, і праз секунду пагранічнікі, залегшыя з вінтоўкамі напагатове, пачулі яго рэў, і з-за стогу, матаючы рукою, у якую ўчапіўся і не выпускаў сабака, выскачыў чалавек. Невядомы стараўся аслабаніцца ад сабакі, але сабака з маланкавай быстрынёй выпусціў яго руку і, ускочыўшы ворагу на спіну, упіўся зубамі ў яго плячо і паваліў на снег. Далей справу вырашалі секунды. Начальнік заставы ў некалькі прыжкоў аказаўся побач з парушальнікам, а яшчэ праз некалькі секунд вораг, злобна азіраючыся, ляжаў на спіне, звязаны па руках і нагах. Снег, прыліпшы да яго твару, нагадваў страшэнную белую маску, на якой жывымі былі толькі вочы і раскрыты перасохшы рот. З рота з хрыпам вырываліся клубы пару. Вобыск адняў нямнога часу...

Начальнік заставы, усміхаючыся, сказаў:

— Гэта вёска Н. Кілометраў сорак ад нашай заставы. Далёка забраліся. Усё пакуль добра. Толькі-б другога цяпер раздабыць... Потым развязаў ногі парушальніку.

— Ну-ка, устань.

Той ляжаў, не рухаючыся.

— Устань, гавару...

— Я... ізарваў мяне ваш... сабака, — пачуўся хрыплы голас. Вынуўшы індывідуальны перавязачны пакет, начальнік заставы перавязаў бандыта і падняў яго на ногі.

Пасля гэтага яны рушыліся ў напрамку да вёскі ўслед за ідучым наперадзе парушальнікам.

***

На ваколіцы вёскі пагранічнікі сустрэлі цікавае шэства. У запрэжаных санях ляжаў звязаны невядомы. Кіраваў канём малады калгаснік з тапаром за поясам, а старык-калгаснік гадоў 60 у кажуху і з бярданкай спакойна сядзеў на нагах звязанага. За санямі ішло 15 калгаснікаў і калгасніц, ажыўлена аб чымсьці гаварыўшых.

— Таварыш начальнік! Злодзея на гумнах злавілі. Да вас вязем, а вы і самі да нас..

Начальнік заставы цяжка апусціўся на сані, побач са старым. Пагранічнік зрабіў тое-ж самае. Прыведзены парушальнік стаяў, патупіўшы галаву, напэўна не жадаючы сустрэцца поглядам з ляжачым у санях.

***

...Начальнік заставы закончыў пісаць данясенне. Пагасіў дакураную папіросу і вышаў з пакоя. Праходзячы па карыдору, ён зірнуў на кухню. Двое пагранічнікаў, якія толькі што вярнуліся з граніцы, пілі чай. Пад кацёл, у якім кіпела вада, дзяжурны па заставе падкідваў дровы і ціха мурлыкаў:

«Широка страна моя родная,
Много в ней лесов, полей и рек...»

— Як Фёдараў і Кананенка сябе адчуваюць?

Дзяжурны выпраміўся:

— Спяць, зразумелая справа. Заўтра будуць, як устропаныя.

— Яны малайцы. 40 кілометраў, па калена ў снягу, амаль бягом.

— Дык і вы-ж з імі, таварыш начальнік...

Начальнік заставы нахмурыўся. Потым зірнуў на дзяжурнага і раздумліва сказаў:

— Вось вы спяваеце «Широка страна моя родная»... Гэта правільна. Вельмі правільна... Дык вось, каб у гэту шырокую і родную краіну сволач якая не прапаўзла, глядзець у абодвы трэба, ну і не толькі глядзець, вядома. Праўда, дзяжурны?

— Правільна, таварыш начальнік.

Пагранічнікі шырока ўсміхнуліся адзін аднаму.

ХВАЛЯВАННІ Ў ГЕРМАНСКАЙ АРМІІ

ПРАГА, 15 лютага. (БЕЛТА). Рабочая газета «Гало новіны», спасылаючыся на весткі, паступіўшыя з Германіі, паведамляе, што камісіі, складаныя з вышэйшых афіцэраў фашысцкіх ахоўных атрадаў («СС») і фашысцкіх афіцэраў рэйхсвера, пачалі работу па «чыстцы» афіцэрскага і унтэр-афіцэрскага складу рэйхсвера, мэтай якой з'яўляецца ўдаленне з армії ўсіх асоб, сімпатызуючых апазіцыі і крытыкуючых фашысцкую сістэму. Камісіі, піша газета, маюць права арыштоўваць і прыгаварваць да кары смерцю. Ва ўсіх месцах, дзе ёсць гарнізоны, сярод афіцэраў, унтэр-афіцэраў і салдат велізарная трывога і ўзбуджэнне, якія перадаюцца насельніцтву краіны.

На ўсіх границах уведзен найтаўнейшы нагляд фашысцкіх ахоўных атрадаў, якія падвяргаюць кожнага едучага ўсебаковай і шматразовай праверцы.

Камандаванню ахоўных атрадаў загадана быць гатовымі да выступлення ў любы момант у выпадку неабходнасці.

***

ЛОНДАН, 15 лютага. (БЕЛТА). Газета «Стар» публікуе вытрымкі з толькі што выйшаўшай у Лондане кнігі, у якой апісваюцца настроі ў германскай армії. Аўтар кнігі Рэйман піша, што многія афіцэры германскай армії не задаволены фашысцкім рэжымам і адкрыта выказваюцца ў карысць парламенцкага ладу. Рост антыфашысцкіх настрояў сярод салдат надзвычайна непакоіць кіраўнікоў армії.

Германскія ваенныя колы,—гаворыць аўтар,—не верачы, што фашысты выкаранілі комунізм у Германіі, баяцца, што армії прыдзецца ваяваць з народам.

У 1936 годзе лётчыкі паветраных часцей у Берліне адмовіліся ўдзельнічаць у манеўрах у Мекленбургу. Яны арганізавалі пасіўнае супраціўленне і сабатавалі манеўры.

Кіраўнікі германскай армії,—прадаўжае аўтар,—адказваюць на гэтыя настроі спробай умацаваць дысцыпліну палачнымі метадамі, але гэта дае толькі процілеглыя рэзультаты.

У заключэнне аўтар піша, што ў сувязі з мілітарызацыяй германскіх фабрык стваралася напружаная адносіны паміж адміністрацыяй прадпрыемстваў і рабочымі, з якімі ва многіх выпадках абыходзяцца, як з рабамі. «Германскі мілітарызм не змог заваяваць на сваю старану рабочы клас. Няма ні аднаго рабочага ў Германіі, які быў-бы гатоў змагацца і памерці за фашысцкую бацькаўшчыну».

—о—

Мацнее адзіны антыфашысцкі фронт

ПРАГА, 15 лютага. (БЕЛТА). Газета «Дэйчэ фальксцайтунг» паведамляе аб умацненні нелегальнай рэволюцыйнай дзейнасці берлінскіх рабочых. Па вестках газеты, комуністычныя і соцыял-дэмакратычныя рабочыя Берліна арганізоўваюць адзіны фронт барацьбы супроць фашызма. Падпольныя арганізацыі—неўлавімыя для Гестапо — у апошні час значна ўзраслі і ўзмацнілі сваю дзейнасць. Рост актыўнасці антыфашыстаў адзначаецца не толькі ў Берліне, але і ў іншых гарадах Германіі. Прычым у цэлым радзе раёнаў да адзінага фронта комуністычных і соцыял-дэмакратычных рабочых далучаюцца таксама рабочыя з каталіцкіх арганізацый.

Дэманстрацыя беспрацоўных у Парыжы.

РОСТ БЕСПРАЦОЎЯ У ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА, 14 лютага. (БЕЛТА). Беспрацоўе ў Польшчы прадаўжае быстра павялічвацца. Згодна прыведзеных газетай «Роботнік» афіцыяльных даных, на 1 лютага гэтага года лік зарэгістраваных у Польшчы беспрацоўных складаў 545.947 чалавек; за адзін месяц—студзень лік афіцыяльна зарэгістраваных беспрацоўных павялічыўся на 82.940 чалавек.

***

ВАРШАВА, 16 лютага. (БЕЛТА). «Дзённік людовы» прыводзіць даныя, якія сведчаць аб выключна цяжкім матэрыяльным становішчы чыгуначных служачых. Газета ўказвае, што значная частка польскіх чыгуначнікаў, месячная зарплата якіх складае ў сярэднім каля 175 злотых, фактычна атрымлівае на рукі толькі 40—60 злотых, астатнія-ж грошы ўтрымліваюцца, у парадку адлічэнняў, па так званаму «надзвычайнаму» падатку, па соцстраху, па членскіх узносах у розныя ўрадавыя арганізацыі і інш.

ГОЛАД ЛЮТУЕ У ВЁСКАХ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

ВАРШАВА, 16 лютага. (БЕЛТА). Урадавая «Газета польска» ў карэспандэнцыі з Палесся паведамляе аб бядотным становішчы беларускіх сялян у Польшчы. Газета піша:

«Ва ўсім Палессі лютуюць голад і галеча. Размеры збяднення вёсак і мястэчак Палесся наводзяць жах. Людзі кормяцца карэннямі і хлебам з бярозавай кары. Дзеці ходзяць у школу босыя і поўгалодныя, атрымліваючы ад матак замест снедання ком варанай бульбы».

«Газета польска» паведамляе далей аб абураючых злоўжываннях «добрачынных» камітэтаў па аказанню дапамогі беспрацоўным у Палессі. «У гэтых камітэты, — піша газета, — прыходзяць беспрацоўныя, якім адмаўляюць у выдачы дапамогі таму, што яны забыліся своечасова зарэгістравацца; разам з тым выяўлены выпадкі выдачы камітэтамі дапамог домаўласнікам».

НАСУСТРАЧ XX ГАДАВІНЕ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТА

МОТАЛЫЖНАЯ ЭСТАФЕТА ВІЦЕБСК—МЕНСК

ВІЦЕБСК, 16 лютага. (Кар. «Звязды»). Сёння ў 2 гадзіны дня на пляцу Волі дан старт моталыжнай эстафеце імя XX гадавіны РСЧА і Ваенна-Марскога Флота. Маршрут эстафеты — Віцебск — Орша — Магілеў — Бярэзіна — Менск. У прабегу прымаюць удзел 3 вадзіцелі матацыклаў, шофер фабрыкі «КІМ» Афманскі, стахановец скурзавода Рубінштэйн, камандзір Н-скай часці Шустаў і лыжнікі: Перлін — слесар фабрыкі «КІМ», Костка — студэнт ветэраінстытута і Тарноўскі — студэнт рабфака сувязі.

У Оршы і Магілеве да Віцебскай каманды далучацца ўдзельнікі моталыжных эстафет гэтых гарадоў.

НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ БАБРУЙСКА

На прадпрыемствах Бабруйска ідзе ўзмоцненая падрыхтоўка да 20-годдзя Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. Праводзяцца гутаркі, прысвечаныя слаўнаму юбілею. 21 лютага на фабрыцы імя Дзержынскага адбудзецца палітдзень, прысвечаны Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскому Флоту. На фабрыцы імя Халтурына да 23 лютага рыхтуецца выпуск 10 варашылаўскіх стралкоў і 20 значкістаў па ППХА. Бібліятэка ленкутка фабрыкі папоўнілася новымі творамі мастацкай літаратуры на абаронныя тэмы.

Бабруйскі райсавет Асоавіяхіма падрыхтоўвае выпуск 18 інструктароў-масавікоў па стралковай справе і 23 інструктароў па ППХА. 18 лютага наладжваюцца стралковыя спаборніцтвы з удзелам 8 каманд горада — ад камбіната, арцелі «Чырвоны металіст» і т. д.

ПАЛІТДНІ Ў КАЛГАСАХ

УЗДА. У раёне шырока разгорнута падрыхтоўка да святкавання 20-годдзя РСЧА і Ваенна-Марскога Флота. На прадпрыемствах і ў калгасах праводзяцца гутаркі па гісторыі грамадзянскай вайны. Вылучана 13 чалавек з райпартактыва для правядзення палітдзён у калгасах на тэму «ВКП(б) — арганізатар і правадыр Чырвонай Арміі».

Асоавіяхімаўскія арганізацыі раду калгасаў рыхтуюць выпускі варашылаўскіх стралкоў, праводзяцца трэніровачныя заняткі па падрыхтоўцы да лыжнага пераходу.

У калгасах на ўрачыстых сходах, прысвечаных слаўнаму юбілею, выступяць з успамінамі ўдзельнікі грамадзянскай вайны.

ШЭФСКІЯ КАНЦЭРТЫ

17 лютага ансамбль беларускай народнай песні і пляскі Беларускай дзяржаўнай філармоніі выязджае ў гастрольную паездку. У Бабруйску, Гомелі і іншых гарадах ансамбль дасць рад шэфскіх канцэртаў для чырвонаармейцаў і камандзіраў часцей гарнізонаў. У праграме выступленняў — беларускія, яўрэйскія і рускія народныя песні і беларускія народныя танцы «юрачка», «лявоніха». Вылучаны лепшыя артысты для дапамогі калектывам чырвонаармейскай самадзейнасці ў падрыхтоўцы юбілейных праграм.

У АЭРАКЛУБАХ

Да 20-годдзя Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота аршанскі аэраклуб падрыхтоўвае чарговы выпуск пілотаў, якія навучаліся без адрыву ад вытворчасці. У юбілейныя дні намечана правесці 2 авіямасоўкі на Белдрэсе і ў Шклове. 8 агітатараў аэраклуба праводзяць сярод хатніх гаспадынь гутаркі аб гераічным шляху Чырвонай Арміі.

Вучлёты і камандны склад гомельскага аэраклуба заключылі дагаворы соцспаборніцтва на лепшую сустрэчу XX гадавіны Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. Арганізуюцца сустрэчы вучлётаў з удзельнікамі грамадзянскай вайны.

—о—

ЯШЧЭ РАЗ АБ УНІВЕРСІТЭЦЕ

(Пісьмо ў рэдакцыю газеты «Звязда»)

На старонках друку ўжо не раз з'яўлялися сігналы аб недахопе высокакваліфікаваных навуковых кадраў у Беларускім дзяржаўным універсітэце. Арудваўшыя ў БДУ і Наркамасветы ворагі народа давялі універсітэт да такога становішча, што зараз там амаль няма высокакваліфікаваных спецыялістаў па большасці асноўных прадметаў. Дастаткова сказаць, што на фізіка-матэматычным факультэце няма ні аднаго прафесара ні па фізіцы, ні па матэматыцы. У такім-жа становішчы знаходзяцца геаграфічны і іншыя факультэты. Важнейшыя курсы чытаюць непадрыхтаваныя выкладчыкі, а па многіх дысцыплінах лекцыі наогул не чытаюцца. Асабліва пагражаючае становішча з аспірантамі, з імі амаль няма каму займацца.

Нарком асветы БССР тав. Півавараў і рэктар БДУ тав. Бабраўніцкі даручылі дэканам факультэтаў праявіць усю сваю ініцыятыву для падшукання неабходных спецыялістаў. Яны запэўнілі, што, знайдзіце толькі людзей, мы забяспечым для іх работы ўсе неабходныя ўмовы, у тым ліку і кватэры.

На падставе гэтых запэўненняў дэкан фізіка-матэматычнага факультэта тав. Шапіра з вялікай пяжкасцю дагаварыўся з прафесарам Маскоўскага універсітэта тав. Гельфандам аб пераездзе яго ў Менск для пастаяннай работы ў БДУ. Атрымаў абяцанне і яшчэ раду буйных матэматыкаў.

Здавалася-б, астаецца толькі падтрымаць гэта добрае пачынанне, якое кладзе, нарэшце, пачатак сапраўднай работы на фізмаце. На словах гэты пачын, вядома, падтрымалі, але на справе не дапамаглі. 30 студзеня праф. Гельфанд прыехаў у Менск. З ім заключылі дагавор на правядзенне заняткаў са студэнтамі і аспірантамі. Уключылі пункт і аб прадастаўленні яму кватэры. Дагавор зацвердзіў нарком асветы тав. Півавараў. Ён-жа абяцаў даць кватэру.

11 лютага прафесар Гельфанд на аснове тэлеграмы рэктара прыязджае ў другі раз у Менск з намерам увяцца за пастаянную работу ў БДУ. Але прыехаўшы, ён усё-ж кватэры не атрымаў. Звоняць тэлефоны з адной установы ў другую, а кватэры для прафесара так і няма. Прафесар Гельфанд, адзівіўшыся лёгкадумствам некаторых работнікаў, заключыўшых з ім дагавор і зацвердзіўшых яго, заяўляе аб сваім ад'ездзе ў Маскву, дзе ён мае кватэру і работу.

Пара пакласці канец гэтаму.

Дэкан фізіка-матэматычнага факультэта БДУ, дацэнт ШАПІРА І. П.
Старшыня мясцкома БДУ, дацэнт НЕКРАШЭВІЧ І. Г.

Пры віцебскім клубе работнікаў совецкага гандлю працуюць тры гурткі — па раялю, скрыпцы і балету, дзе займаюцца дзеці работнікаў совецкага гандлю. На здымку: выкладчыца па раялю тав. Р. Шапыт праводзіць заняткі. Ля раяля Алег Жданові ч.

Фото С. Грына.

ОПЕРА „ЗАПАРОЖАЦ ЗА ДУНАЕМ" У ПАСТАНОЎЦЫ САМАДЗЕЙНАГА КАЛЕКТЫВА

Далёка за межамі раёна славіцца калектыў мастацкай самадзейнасці Горацкага сельскагаспадарчага інстытута. Вялікім поспехам карысталіся яго выступленні ў Оршы. За выдатнае выкананне оперы «Запарожац за Дунаем» калектыў атрымаў прэмію ў 3 тысячы рублёў ад Дома народнай творчасці БССР.

Па запрашэнню Ўпраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР 19 лютага ў Менск прыязджаюць 120 удзельнікаў мастацкай самадзейнасці інстытута—студэнты, прафесары, навуковыя работнікі і іх жонкі. У дні святкавання 20-годдзя Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота калектыў паказа працоўным Менска оперу «Запарожац за Дунаем».

Сімфанічным аркестрам дырыжыруе дацэнт-матэматык тав. Шапіра. Яго жонка выконвае ў оперы вядучую ролю Оксаны. Балетам кіруе бухгалтар інстытута тав. Гагарына.

—о—

СТРАЛКОВЫЯ КЛУБЫ НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ

Цэнтральны Совет Асоавіяхіма БССР рашыў у гэтым годзе адкрыць на фабрыках і заводах рэспублікі 15 стралковых клубаў. Першы стралковы клуб адкрываецца ў бліжэйшы час на менскім станкабудаўнічым заводзе імя Варашылава, дзе ёсць заводскі цір і кваліфікаваныя інструктары. Стралковыя клубы будуць служыць справе развіцця масавага стралковага спорта.

—о—

НОВЫЯ РАБОТЫ БЕЛАРУСКІХ СКУЛЬПТАРАЎ

Беларускі скульптар тав. Бембель па даручэнню Кіраўніцтва Дома ўрада ў Менску робіць статую палкага трыбуна рэволюцыі С. М. Кірава. Эскіз ужо закончан. Статуя будзе велічынёй у 2 метры 20 сантыметраў. Скульптар тав. Ізмайлаў робіць статую вялікага пролетарскага пісьменніка М. Горкага. Эскіз ужо зроблен. Статуі будуць устаноўлены ў фае залы з'ездаў Дома ўрада.

ПАМЯЦІ СЕРГО ОРДЖАНІКІДЗЕ

МАГІЛЕЎ. На прадпрыемствах горада праводзяцца гутаркі і чыткі матэрыялаў аб жыццёвым шляху незабыўнага Серго Орджанікідзе. У клубах рыхтуюцца выстаўкі кніг і фотаздымкаў. Бібліятэка шаўковай фабрыкі арганізавала выстаўкі ў чырвоных кутках цэхаў.

У дзень гадавіны на ўсіх прадпрыемствах і ўстановах горада будуць праведзены жалобныя сходы, прысвечаныя светлай памяці Серго.

—о—

ЭЛЕКТРЫФІКАЦЫЯ КАЛГАСАЎ БССР

Дарэволюцыйная беларуская вёска не мела ўяўлення аб электрычнасці. Нізкія, убогія хаты сялян асвятляла лучына, а ў рэдкім выпадку — газавая лямпа. Толькі совецкая ўлада дала беларускай вёсцы электрычнае святло. Лямпачка Ільіча ярка гарыць нават у самых аддаленых калгасах Палесся, электрычнасць аблягчае працу калгаснікаў.

Толькі за адзін 1937 год па БССР пушчаны пяць новых калгасных гідраэлектрастанцый. Лямпачка Ільіча запалілася ў дамах калгаснікаў калгасаў «Чырвоны Кастрычнік», Смалявіцкага раёна, «Прагрэс», Сіроцінскага раёна, «Чырвоны бор», «Завет Ільіча», Старобінскага раёна і т. д. У 65 калгасах рэспублікі праведзена расшырэнне існуючай электрасеткі. 18 калгасаў Шклоўскага, Магілеўскага, Гомельскага і іншых раёнаў атрымалі электрычнасць ад БелДРЭС'а і гарадскіх электрастанцый. Устаноўлена 69 матораў для электрыфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці. Апрача таго электрыфікаваны Лупалаўская, Магілеўская і Цімкавіцкая МТС.

У гэтым годзе ўвойдуць у строй яшчэ 15 калгасных гідраэлектрастанцый, якія электрыфікуюць 24 калгасы ў Чавускім, Чэрыкаўскім, Мсціслаўскім, Дрыбінскім і інш. раёнах. У 50 калгасах рэспублікі будзе праведзена пашырэнне існуючай электрасеткі. Новыя 12 тысяч электралямп запаляцца ў дамах калгаснікаў.

У гэтым годзе пачнецца будаўніцтва міжкалгаснай электрастанцыі ў Капыльскім раёне, якая будзе абслугоўваць 10 калгасаў.

—о—

ДЗЯРЖАЎНАЯ ДАПАМОГА ШМАТДЗЕТНЫМ МАЦЕРАМ

Па БССР выплачана шматдзетным мацерам дапамогі на агульную суму 51.375 тыс. рублёў. Дзяржаўную дапамогу атрымалі больш 15 тыс. мацярэй.

—о—

БАРАЦЬБА З ГРЫПАМ

У Менску пры ўсіх паліклініках, на буйных прадпрыемствах і пры інтэрнатах абсталявана больш 20 хлорных камер для прафілактыкі захворвання грыпам. У паліклініках камеры адкрыты штодзённа з 12 да 5 гадзін дня. Вопыт мінулых год паказаў спрыяючыя рэзультаты карыстання гэтымі камерамі.

—о—

ДЗЁННІК

Даклад тав. Клышко на тэму «Роля таварышоў Леніна і Сталіна ў арганізацыі разгрому 3 паходу Антанты» адбудзецца 18 лютага, у 7 гадзін вечара, у Доме партактыва.

—◆—

АД СТАЛІНСКАГА РК КП(б)Б

Тт. СТЭЦКІ А. П., КАЖДАН Х. І., НОВІКАЎ В. А., САГАЛОВІЧ Г. А., СЕНКЕВІЧ А. І., БУНІН У. Ш., ВЕРТЫНСКІ А. А. і СКІВІЦКІ Г. А. выключаюцца за ўчоты аддзел Сталінскага РК КП(б)В (Чырвонаармейская, № 16).

АД МАГІЛЁЎСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б

Згублены партыйны білет № 0858764, выданы Магілеўскім РК КП(б)В на імя Шульмана Файва Шоламава, лічыць несапраўдным.

АД ЖЛОБІНСКАГА РК КП(б)Б

Згублены партыйны білет за № 0861401, выдадзены Жлобінскім РК КП(б)В на імя Крукоўскага Івана Ларыёнавіча, лічыць несапраўдным.

Намеснік адказнага рэдактара
І. М. ОФЕНГЕЙМ.

Дзяржстрах СССР

ДА ВЕДАМА КАМСОДАЎ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ, УСТАНОЎ, АРГАНІЗАЦЫЙ, АРЦЕЛЕЙ, СОЎГАСАЎ І КАЛГАСАЎ, ПРОФСАЮЗНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ І СТРАХАВЫХ ІНСПЕКЦЫЙ ГОРРАЙФА

АБ ПАРАДКУ АФАРМЛЕННЯ КАЛЕКТЫЎНАГА СТРАХАВАННЯ ЖЫЦЦЯ

1. Новыя правілы дабраволь нага калектыўнага страхавання жыцця ўступілі ў сілу з моманту іх выдання, гэта значыць з 4 студзеня 1938 года і распаўсюджваюцца на ўсе дзейнічаючыя калектыўныя страхаванні жыцця і з прымяненнем усіх ільгот.

2. На ўноў праведзеныя калектыўныя страхаванні жыцця камсоды і ўпаўнаважаныя пры адачы сабраных сум страхавых узносаў павінны неадкладна прадставіць страхавым інспекцыям спісы (у арыгінале) застрахаваных асоб з завяшчаннямі і плацежныя спісы па збору страхавых узносаў з уласнаручнымі подпісамі саміх застрахаваных для афармлення страхавання страхавымі дагаворамі.

3. Збор страхавых узносаў у калектывах павінен працягвацца ад аднаго да пяці дзён. У двухдзённы тэрмін па сканчэнні збору ўзносаў камсоды павінны здаць сабраныя сумы на рахунак Дзяржстраха ў Дзяржбанк, ашчадкасу ці ў касу горрайфа. На зданыя сумы сістэматычна прадстаўляюцца страхавым інспекцыям плацежныя спісы (у арыгінале) па збору страхавых узносаў (з указаннем чысла, месяца ўплаты кожным застрахаваным) з уласнаручнымі подпісамі саміх застрахаваных.

4. Забараняецца страхавым інспекцыям горрайфа выдаваць камсодам страхавыя пасведчанні для застрахаваных да прадстаўлення ў страхавыя інспекцыі плацежных спісаў і да афармлення страхаванняў страхавымі дагаворамі.

Страхаванні павінны афармляцца выключна на бланках-спісах, устаноўленых Дзяржстрахам.

Унесеныя камсодамі на рахунак Дзяржстраха страхавыя узносы без належнага афармлення падлягаюць звароту і страхаванне лічыцца не праведзеным.

Аб парадку і часе пераходу на марачную сістэму па калектыўнаму страхаванню жыцця будзе паведамлена асобна.

УПРАЎЛЕННЕ ДЗЯРЖСТРАХА НКФ БССР.

НАРОДНЫ КАМІСАРЫЯТ АСВЕТЫ БССР
АРГАНІЗУЕ 6-МЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ
ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ НАСТАЎНІКАЎ РУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ
для 5—7 класаў НСШ і СШ.

КУРСЫ арганізоўваюцца пры наступных педінстытутах: Менскім — на 90 чал., Магілеўскім — на 60 чал., Гомельскім — на 60 чал.; пры настаўніцкіх інстытутах: Аршанскім — на 60 чал., Рагачоўскім — на 60 чал. Усяго на 330 чал.

На курсы прымаюцца асобы ад 17 да 35 год, якія маюць закончаную агульную сярэднюю асвету (скончыўшыя сярэднюю школу, рабфак, тэхнікум і прыроўненыя да іх навучальныя ўстановы).

Для паступлення на курсы трэба падаць заяву на імя дырэктара інстытута з наступнымі дакументамі: атэстат або пасведчанне аб адукацыі, аўтабіяграфію, характарыстыку з месца работы або навучальнай установы.

Курсанты забяспечваюцца стыпендыяй да 150 руб. у месяц і інтэрнатам або кватэрнымі.

Пачатак заняткаў з 1 сакавіка 1938 г.

НАРОДНЫ КАМІСАРЫЯТ АСВЕТЫ БССР.

Беларускі Дзяржаўны Драматычны тэатр
II лютага Абан. № 139
ВОЧНАЯ СТАЎКА

Гукавы кінотэатр «Чырвоная зорка»
ВАЛАЧАЕЎСКІЯ ДНІ
Пачатак у 5, 7, 9 і 11 г. веч.

Дзіцячы гукавы кінотэатр
БЯЛЕЕ ПАРУС АДЗІНОКІ

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал»
«ВРАТАР»

Гукавы кінотэатр «Спартак»
БЕСПАСАЖНІЦА

Гукавы кінотэатр „ПРОЛЕТАРЫЙ"
СЁННЯ на экране
гукавы мастацка-дакументальны фільм
Серго Орджанікідзе

ЗБЕРАЖЭННІ
ЗРУЧНА І ВЫГАДНА ЗАХОЎВАЦЬ
У ашчаднай касе
АШЧАДНЫЯ КАСЫ
Прымаюць уклады ад усіх грамадзян.
І выдаюць уклады часткамі, або поўнасцю па першаму патрабаванню ўкладчыка.
Строга захоўваюць тайну і недатыкальнасць укладаў.
Прымаюць ад укладчыкаў завяшчальныя распарадженні па ўкладах.
Уплачваюць укладчыкам процанты па ўкладах.
Пераводзяць па першаму патрабаванню ўкладчыка яго ўклад у любую іншую ашчадную касу.
Выдаюць і аплачваюць акрэдытывы.
Аплачваюць выгрышы і купоны па аблігацыях дзяржаўных пазык.
Ці з'яўляецеся Вы укладчыкам ашчаднай касы?

Паводзіцца да ведама ўсіх аўтатрактаракарыстальнікаў,
што, згодна пастановы СНК СССР ад 16 лістапада 1937 г. за № 2037 і загада па Наркамату Машынабудаўніцтва ад 15 снежня 1937 г. № 128,
БЕЛКАНТОРА „ГУТАП"
з усімі падпарадкаванымі ёй агенцтвамі
ПЕРАХОДЗІЦЬ у склад „ГЛАВАВТОТРАКТОРОДЕТАЛЬ"
Функцыі канторы і агенцтваў, а таксама адрас астаюцца ранейшыя. Кантора імянуецца: БЕЛАРУСКАЯ РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАНТОРА па збыту Галоўнага Ўпраўлення па вырабу аўтамабільных і трактарных запчастак «ГЛАВАВТОТРАКТОРОДЕТАЛЬ».
Тэлеграфны адрас: Менск, «Автотрактородетальсбыт».

НАРКАМХАРЧПРОМ СССР ГАЛОЎПАРФУМЕР
ПАТРАБУЙЦЕ УСЮДЫ! НОВЫ ВЫПУСК
ФЛОРА
ОПТИКС

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Менск, Совецкая, 63. Тэлефоны рэдакцыі: рэдактара — 21-352; сакратарыята — 20-839. АДДЗЕЛАЎ: партыйнага — 21.353, совецкага будаўніцтва і гандлю — 22-412, прамысловага — 21-356, сельскагаспадарчага — 21.846, літаратуры, мастацтва, навукі і асветы — 23-855, мясцовай і замежнай інфармацыі — 25.189, аддзела пісем — 20.844, 21-399, 21.885, ілюстрацыйнага і стыльрэдактуры — 21.556, абʼяў — 21-845.

Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая 63.

Уп. Галоўлітбела № И-5438.

К., Л., Б.